Ужо ў лютым 1863 г., адразу ж пасля з'яўлення літоўскага маніфеста, пачалі фарміравацца першыя партызанскія атрады, у тым ліку і на Гарадзеншчыне. Аднымі з першых былі ўтвораны фарміраванні ў Ашмянскім, Лідскім паветах, а таксама ў Налібоцкіх лясах Навагрादскага павета. Напрыклад, на Лідчыне, пасля распаўсюджвання маніфеста пра пачатак паўстання па парафіях, месцам канцэнтрацыі паўстанцаў сталі лясы каля Дубіч. Ужо 16 лютага лідскі атрад, сфармаваны пераважна з сялян, правёў сваю першую акцыю, адбіўшы партыю рэкрутаў. У лютым пачало дзейнічаць фарміраванне пад кіраўніцтвам былога студэнта Ф. Віславуха. Месцам яго ўтварэння сталі лясы ў Свянцянскім павеце. Адтуль, пад націскам царскіх войскаў, ён перавёў сваіх людзей у Ашмянскі павет, дзе пад Гервятамі спазнаў першае паражэнне. Пад Смаргонню, не атрымаўшы спадзяванай падтрымкі, Ф. Віславух распусціў свой атрад. Як вынікае з гэтых прыкладаў, першыя мясцовыя фарміраванні былі досыць кволымі, не здольнымі да вядзення маштабнай партызанскай вайны.

Зразумеўшы ўсю слабасць і непадрыхтаванасць літоўска-беларускага рэгіёна да ўзброенай


Мечыслаў Гліндзіч, кіраўнік Ваўкавыскага паўстанцкага атрада. 1864 г. *LVIA. F. 439. Ap. 1. B. 148. L. 41–41 v.*

барацьбы ўзімку 1863 г., Варшаўскі ўрад накіраваў сюды партызанскія сілы з тэрыторыі этнічнай Польшчы, каб распаўсюдзіць полымя паўстання на гэтыя землі. Асноўным месцам дзеяння гэтых атрадаў стала Гарадзенская губерня (пераважна яе заходняя частка). Гэта былі аддзелы пад камандаваннем У. Ціхорскага (Замэчка), В. Левандоўскага, Р. Рагінскага, Я. Матлінскага (Сокала), С. Сангіна. Яны дзейнічалі самастойна, без супрацоўніцтва з мясцовай рэвалюцыйнай арганізацыяй ці віленскім цэнтрам. Да асноўных акцый гэтых атрадаў можна прылічыць авалоданне Суражам, Пружанамі, а таксама бой за Семяцічы, калі асноўныя сілы паўстанцаў былі разбіты. У цэлым, нягледзячы на некаторыя лакальныя поспехі, дзеянні партызан, якія прыйшлі з-за мяжы, не прынеслі тых вынікаў, на якія разлічваў варшаўскі цэнтр. Мясцовая канспірацыя на той час не была яшчэ гатова да ўключэння ва ўзброеную барацьбу.

Падзеі ў Каралеўстве Польскім, пачатак паўстання на землях Літвы і Беларусі стымулявалі актыўнасць партыі «белых». Прынята лічыць, што асноўнай прычынай іх пераходу да больш актыўных дзеянняў было імкненне не дапусціць перарастання паўстання ў сацыяльную рэвалюцыю. Аднак гэта была толькі адна (і, мусіць, не самая галоўная) з падстаў. Яшчэ да пачатку паўстання некаторая частка гэтага палітычнага лагера зразумела беспаспяховасць спроб дабіцца ўступак ад расійскіх улад мірным шляхам і далучылася да канспіратыўнай дзейнасці. З пачаткам узброенай барацьбы, пасля першых рэпрэсіўных мерапрыемстваў з боку царскай адміністрацыі, і найбольш зацятыя прыхільнікі гэтага шляху зразумелі марнасць сваіх надзей. Яскравым прыкладам з'яўляецца асоба гарадзенскага маршалка шляхты В. Стажэньскага, ідэолага «згодніцкай» плыні, які, усвядоміўшы, што ўзброенай барацьбы з царызмам не пазбегнуць, у сярэдзіне сакавіка 1863 г. дэманстратыўна падаў у адстаўку, звярнуўшыся пры гэтым з адкрытым заклікам да чыноўнікаў мясцовай адміністрацыі зрабіць так, як ён. Яго ўчынак падтрымалі ўсе павятовыя маршалкі губерні, многія міравыя пасрэднікі, чыноўнікі розных узроўняў. Асноўная прычына такога кроку бачыцца ў іх імкненні тым самым паралізаваць дзейнасць усёй мясцовай адміністрацыі, выклікаць крызіс усёй царскай сістэмы кіравання ў краі.

Імперская стаўка на раскол

Сярод іншых прычын, якія стымулявалі актывізацыю «белых», можна адзначыць узмацненне пазіцый гэтага палітычнага крыла ў кіраўніцтве паўстаннем у Польшчы, а таксама пашырэнне чутак пра магчымую хуткую інтэрвенцыю заходнееўрапейскіх краін супраць Расіі. Гэты факт занатавалі шматлікія тагачасныя дакументы. Напрыклад, праводзячы агітацыйную працу ў Гарадзенскай губерні, доктар Ф. Ажэшка сярод асноўных аргументаў даводзіў, што «хутка прыйдуць французы і англічане, і будзе Польшча» (падобных прыкладаў мноства). Акрамя таго, уступаючы на шлях узброенай барацьбы, шляхта даволі часта кіравалася перакананнем у традыцыйным дамінаванні сваёй сацыяльнай групы ў нацыянальна-вызваленчым руху. Лідар мясцовых «белых» Я. Гедройц лічыў, што, калі нават прыняцце праз шляхту кіраўніцтва «не прывядзе да станоўчых вынікаў, тым не менш паўстанне застанецца верным традыцыям нашай даўняй гісторыі». Асабліва актыўнасцю вызначалася дробная шляхта — сацыяльная група, якая пасля паўстання 1830–1831 гг. была ці не галоўным аб'ектам ўціску з боку царызму.



Ігнат Здановіч (1841–1863), павешаны на Лукішскай плошчы ў Вільні 21 снежня 1863 г. LVIA. F. 439. Ap. 1. B. 147. L. 122.

7 лютага 1863 г. у Вільні адбыўся з'езд дэлегатаў «белых». На ім фактычна была выпрацавана новая канцэпцыя дзейнняў гэтага лагера, а таксама абраны новы Камітэт. Пры падтрымцы Варшавы гэты орган 27 лютага адхіліў ад кіраўніцтва паўстаннем віленскіх «чырвоных» на чале з К. Каліноўскім і ўзяў уладу ў свае рукі. Адпаведныя змены адбыліся таксама ў кіраўніцтве рэгіянальных канспіратыўных арганізацый. Выключэннем была толькі Гарадзенская губерня, дзе моцныя пазіцыі захавалі «чырвоныя» і асабіста Кастусь Каліноўскі, які быў накіраваны на пасаду камісара Гарадзенскага ваяводства.

У нас, дзецюкі, суды — гэта воўчая яма, дзе не разбіраюць, ці за табой праўда, ці не. Бяспекі ніякай няма, хто дужэйшы, той і глуміць; а войска то не для таго трымаюць, каб аберагаці кожнага ад злых людзей, а для таго, каб не пазволіць народу і застагнаць, калі пазнае сваю няволю, калі згледзіцца, што дзяруць з яго над сілы.

Кастусь Каліноўскі. «Мужыцкая праўда» (выдавалася паўстанцамі ў лясах)


Пашырэнне ўзброенай барацьбы на так званыя заходнія губерні, далучэнне да гэтага руху розных слаёў насельніцтва выклікала значны непакой з боку царскіх улад. 26 студзеня 1863 г. пабачыў свет царскі рэскрыпт, які надаваў віленскаму генерал-губернатару дадатковыя паўнамоцтвы. Гэты ж указ вызначаў ступень адказнасці асоб, якія будуць схоплены са зброяй у руках — іх чакаў ваенна-палявы суд з магчымасцю выканання прысуду на месцы. У некаторых



Альберт Грабоўскі, студэнт з Гарадзенскай губерні. LVIA. F. 439. Ap. 1. B. 148. L. 46.

выпадках правам вынясення і зацвярджэння прысудаў надзяляліся камандзіры вайсковых атрадаў. Таксама для разбору спраў паўстанцаў і тых, хто ім дапамагаў, утвараліся спецыяльныя камісіі. У гэты ж дзень, 26 студзеня, па загадзе генерал-губернатара У. Назімава, у Гарадзенскім, Брэсцкім, Сакольскім і Бельскім паветах Гарадзенскай губерні было абвешчана ваеннае становішча. Ваенным начальнікам Гарадзенскага павета прызначылі камандзіра Калужскага пяхотнага палка палкоўніка Вернера. Адпаведна, пасады ваенна-павятовых начальнікаў былі створаны ў кожным павеце.

Адначасова з гэтымі крокамі царызм нарошчваў вайсковую прысутнасць у рэгіёне. У канцы лютага 1863 г. у гэты раён былі перакінуты з цэнтральных губерняў некалькі новых палкоў гвардыі, і, такім чынам, колькасць расійскага войска ў Віленскай ваеннай акрузе дасягнула амаль што 100 тысяч.



Уладзіслаў Борзабагаты (1831–1886), адзін з арганізатараў паўстання ў Навагрудку. LVIA. F. 439. Ap. 1. B. 154. L. 22.

Пасля дэманстратыўнай адстаўкі многіх чыноўнікаў Гарадзенскай губерні, больш жорсткім зрабілася стаўленне царызму да мясцовага дваранства. Указам ад 19 сакавіка 1863 г. Назімаў атрымаў права звальняць са сваіх пасад міравых пасрэднікаў, валасных і сельскіх старастаў, «якіх ён прызнае нядобранадзейнымі». Адзін з пецярбургскіх дзяржаўных дзеячаў, член Дзяржаўнага савета граф С. Сумарокаў, прапаноўваў пайсці яшчэ далей — пазбавіць мясцовых землеўладальнікаў «рускай нацыянальнасці» (фактычна падданства), прымусіць іх прадаць свае маёнткі і перасяліць іх у Польшчу. Забягаючы наперад, адзначым, што часткова гэтая праграма была рэалізавана М. Мураўёвым і яго спадчыннікамі на пасадзе віленскага генерал-губернатара.

Калі ў дачыненні да мясцовага панавальнага элемента царызм стаў пераважна на шлях рэпрэсій, то ў дачыненні да сялянства ён пачаў выкарыстоўваць іншыя метады. Менавіта ў сялянстве афіцыйны Пецярбург убачыў сваё галоўнае апірышча ў краі і з таго часу пачаў супрацьпастаўляць гэты клас мясцоваму дваранству. З мэтай прыцягнення на свой бок сялян улады пры дапамозе праваслаўнага духавенства і мясцовага вайсковага начальства распачалі шырокую прапагандысцкую кампанію. Асноўны яе сэнс зводзіўся да таго, каб пераканаць гэту сацыяльную групу ў тым, што паўстанне ёсць справай каталіцкіх паноў і шляхты, якія такім чынам імкнуцца вярнуць прыгон і паншчыну, што былі скасаваны царом-вызваляльнікам два гады таму. Найважнейшым практычным крокам уладаў па рэалізацыі гэтай праграмы стала Палажэнне ад 1 сакавіка 1863 г., якое ўносіла значныя карэктывы ва ўмовы рэалізацыі рэформы ад 19 лютага 1861 г. на карысць сялян Гарадзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў. Паводле гэтага ўказа, былыя прыгонныя станавіліся поўнымі ўласнікамі сваёй зямлі, скасоўваўся стан часоваабавязаных, а сума выкупных плацяжоў скарачалася на 20 %. Несумненна, гэты дакумент, а таксама афіцыйная прапаганда ў значнай ступені паўплывалі на стаўленне сялян да паўстання ў цэлым і яго зямельнай праграмы ў прыватнасці.

Лясное братэрства

Уздым паўстанцкага руху на Гарадзеншчыне прыпадаў на вясну 1863 г. Прыход «белых» да кіраўніцтва забяспечыў яму больш трывалую матэрыяльную базу. Сярод мясцовых землеўладальнікаў была распаўсюджана падпіска на грашовыя ахвяраванні на карысць паўстання. Значная частка гэтых узносаў была накіравана на закупку за мяжой гэтак неабходнай зброі. Але значная частка іх так і не дайшла да паўстанцаў. Таму мясцовыя партызаны істотна саступалі добра ўзброеным расійскім карным атрадам, супраць якіх выстаўлялі косы і драўляныя (!) гарматы. Таксама пераважна на памешчыкаў быў ускладзены абавязак па забеспячэнні паўстанцаў харчовымі запасамі.

Пасля з'яўлення першых партызанскіх атрадаў на Гарадзеншчыне да ўзнаўлення ўзброенай

барацьбы прайшоў месяц. За гэты час Віленскім камітэтам, а менавіта З. Серакоўскім, быў распрацаваны план вядзення ваеннай кампаніі на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Асаблівая роля ў гэтым стратэгічным дакуменце адводзілася Ковенскай губерні, дзе планавалася нават стварыць рэгулярнае войска паўстанцаў. Пасля няўдалай спробы рэалізаваць гэты праект найбольш актыўным рэгіёнам нацыянальна-вызваленчага руху стала Гарадзеншчына. Справа па арганізацыі атрадаў тут была перададзена ў рукі Кастуся Каліноўскага, які, пачынаючы з вясны, выконваў функцыю гарадзенскага ваяводскага камісара. Ён правёў вялізную арганізацыйную працу на гэтай пасадзе, інспектуючы атрады, займаючыся іх забеспячэннем, каардынацыяй дзейнасці і вярбоўкай новых прыхільнікаў.

Ваенным начальнікам ваяводства быў прызначаны А. Духінскі, былы эмігрант, асоба, якая была зусім не здатная да выканання сваіх абавязкаў, бо ён не вылучаўся ні энергіяй, ні адпаведнымі здольнасцямі, ні веданнем мясцовых умоў. Пра апошняе сведчыць хаця б той факт, што ён нават не ведаў аб існаванні крэпасці ў Брэсце. Таму не дзіва, што пасля шэрагу адчувальных паражэнняў ён падаў у адстаўку і выехаў за мяжу. Начальнікам ваяводскага штаба паўстанцаў (і фактычна рэальным ваенным начальнікам) быў В. Урублеўскі — адзін з найбліжэйшых паплечнікаў Кастуся Каліноўскага.



Жыжнецкі, кобрынскі памешчык. LVIA. F. 439. Ap. 1. B. 148. L. 97.

Большасць партызанскіх атрадаў Гарадзеншчыны пачалі свой баявы шлях у красавіку — траўні 1863 г., хаця падрыхтоўчая праца вялася яшчэ з зімы. У адпаведнасці з планам, распрацаваным віленскім цэнтрам, у кожным павеце губерні павінны былі паўстаць адзін ці два партызанскія атрады. Звычайна ў лесе стваралася база, дзе назапашваліся ежа, зброя, рыштунак. У вызначаны час дзякуючы сістэме добра наладжаных канспіратыўных зносін у загадзя вызначаным дзеля гэтага месцы збіраўся касцяк будучага атрада. Тут жа звычайна ладзіўся паўстанцкі лагер: узводзілася часовае жытло (звычайна гэта былі буданы), выстаўляліся пікеты, дзейнічала служба па вярбоўцы новых ахвотнікаў, адбывалася навучанне рэкрутаў. Надзвычай важную ролю адыгрывалі леснікі, якія ў большасці сваёй падтрымалі паўстанне. У іх асобе партызаны мелі надзейных праваднікоў і вартаўнікоў, што загадзя абвяшчалі набліжэнне карных атрадаў і своечасова пастаўлялі іншую разведвальную інфармацыю. Забеспячэнне харчовымі запасамі ажыццяўлялася пераважна шляхтай і памешчыкамі. Следчыя справы 1863–1864 гг. утрымліваюць вялікую колькасць матэрыялаў, якія тычацца паставак правіянту, зброі, вопраткі, іншых рэчаў мясцовымі землеўладальнікамі. Таксама пераважна праз панскія маёнткі і шляхецкія сядзібы дзейнічала паўстанцкая пошта, ажыццяўлялася сувязь з Вільняй і іншымі рэвалюцыйнымі цэнтрамі.

Каму барацьба, каму грошы...

Архіўныя дакументы сведчаць (а ўспаміны ўдзельнікаў тых падзей пацвярджаюць), што ў забеспячэнні паўстанцаў актыўны ўдзел таксама прымалі прадстаўнікі іншых сацыяльных груп. У першую чаргу гэта тычыцца сялянства. Але ў адрозненне ад прывілеяванага саслоўя, якое гэта рабіла ў асноўным задарма (як па сваёй ахвоце, так і пад прымусам тых жа самых партызан), сяляне, у пераважнай большасці, аддавалі свае прыпасы за грошы. Гэта задавальняла абодва бакі. Дарэчы, грашовай адзінкай у тыя часы на тэрыторыі Гарадзеншчыны быў не толькі расійскі рубель, але і польскі грош.

Следчыя матэрыялы адзначаюць таксама выпадкі, калі пастаўкамі досыць актыўна займаліся асобы яўрэйскай нацыянальнасці. Пераважна гэта былі дробныя гандляры, якія таксама рабілі гэта за грошы. Невядомы яўрэй пасля ўдалай здзелкі з атрадам З. Мінейкі адзначаў: «...калі б ведаў, што сустрэнуся з паўстанцкай партыяй, то б не тое яшчэ прывёз». Акрамя таго, супрацоўніцтва і дапамога іўдзейскай супольнасці партызанам адбывалася і ў іншай форме, што досыць шырока адлюстравана ў ваенна-следчых справах, а таксама спісах зняволеных за 1863–1864 гг. Апошнія сведчаць, што мясцовыя іўдзеі сярод іншага займаліся «шпіёнствам на карысць паўстанцаў», «зносінамі з паўстанцамі», «нарыхтоўкай вопраткі», непасрэдна «прымалі ўдзел у паўстанні» і г. д. Разам з тым нельга перабольшваць факт ангажаванасці беларуска-літоўскіх яўрэяў у справе нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Іншыя факты пераконваюць у тым, што частка

З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці, і можа раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, — але не жаль згінуць за тваю праўду.

Прымі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае, бо яно як з таго свету толькі для дабра твайго напісана.

Няма ж, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і навуку. Тады ён толькі можа жыць у багацці, праўдзе, тады ён толькі, памаліўшыся Богу, заслужыць неба, калі збагаціць навукай розум, разаўе сэрца і радню цэлую сэрцам палюбіць. Але як дзень з ночу не ходзіць разам, так не ідзе разам навука праўдзівая з няволяй маскоўскай. Дапокуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацтва і ніякай навукі, — адно намі, як скацінай, варочаць будуць не для дабра, але на пагібель нашу.


Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тады толькі зажывеш шчасліва, калі над табою Маскаля ўжэ не будзе.

Твой слуга Яська-гаспадар з-пад Вільні.

Кастусь Каліноўскі. «Лісты з-пад шыбеніцы», напісаныя з турмы

гэтай нацыянальнай супольнасці актыўна супрацоўнічала з царскімі ўладамі ў справе задушэння паўстання. Даносы, выкрыццё сяброў тайных рэвалюцыйных арганізацый, шпіёнства, затрымка непасрэдных удзельнікаў узброенай барацьбы — вось няпоўны пералік тых паслуг, якія яны аказвалі ваеннаму і цывільнаму начальству ў той час. Усё гэта дазваляе зрабіць выснову, што мясцовая іўдзейская супольнасць у 1863 г. таксама апынулася па розныя бакі барыкад, хаця пераважная яе большасць (і гэта не выклікае сумневу) заставалася ў цэлым апалітычнай.

Актыўная дзейнасць па падрыхтоўцы ўзброенага выступлення на Гарадзеншчыне выклікала значны непакой сярод мясцовых улад. У сярэдзіне сакавіка губернскія ўлады атрымалі звесткі пра напад, што рыхтаваўся непасрэдна на губернскі цэнтр. Губернатар І. Галер даносіў у Вільню, што «ад учора намер нападу на Горадню стаў так шырока вядомы, што я быў апавешчаны



Грэгатовіч, паўстанец у вопратцы арыштанта. LVIA. F. 439. Ap. 1. B. 147. L. 95.

пра гэта павятовай паліцыяй». Распаўсюджванне падобных чутак было звязана з падрыхтоўкай выступлення гарадзенскай рэвалюцыйнай моладзі. 14 сакавіка 1863 г. група ў некалькі дзясяткаў чалавек пад кіраўніцтвам былога капітана рускіх войскаў, начальніка станцыі Л. Кульчыцкага зрабіла спробу на цягніку выехаць з горада, каб далучыцца да атрада Л. Нарбута. Аднак у апошні момант, калі паўстанцы занялі месцы ў вагонах, адзін са службоўцаў станцыі адчапіў вагоны ад лакаматыва, і чыгуначны састаў застаўся на вакзале. Моладзь пасля атакі расійскага гарнізона была разагнана. У горадзе ўначы прайшлі маштабныяператрусы, шукалі ўдзельнікаў «чыгуначнай» аперацыі. За краты па гэтай справе трапілі 42 чалавекі, большую частку якіх складалі вучні 3–5-х класаў губернскай гімназіі. Рэалізаваць першапачатковы план да канца ўдалося толькі двум асобам, якія знаходзіліся на лакаматыве.

P. S. У часе падрыхтоўкі гэтага матэрыялу аўтарам прагледжана і скарыстана вялікая колькасць тагачасных дакументаў (у большасці сваёй рукапісных), якія знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Горадні, у гістарычных архівах Вільнюса, а таксама іншыя крыніцы.

Фотаздымкі з фондаў Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва.

Падрыхтавала кандыдат гістарычных навук Вольга ГАРБАЧОВА.

Працяг у наступным нумары

Раман пра каханне?..

Ганна ГАРАЧКА

Чытаючы «Ляльку» Баляслава Пруса, лёгка плыць па паверхні сюжэта, але можна даць нырца ў глыбіню, на колькі хопіць адвагі. «Хто перажыў “Ляльку” — шмат перажыў». Што б маглі значыць гэтыя словы аўтара?

Звычайны сюжэт, але... Купец Вакульскі закахаўся ў збяднелую арыстакратку — панну Ізабэлу. Упарта дабіваўся яе, яна ўжо і згадзілася выйсці за яго замуж, але… Зноў «але» і зноў шматкроп’е. Любімы знак аўтара. Або шматкроп’е, або вось так: «?..» ці так: «!..» Няпэўнасць, няскончаная думка...

Дык вось, Ізабэла ўжо згадзілася выйсці за Вакульскага, яны едуць у цягніку, з імі — нейкі далёкі сваяк, і раптам галоўны герой у адлюстраванні вагоннай шыбы нібыта бачыць, як яго нявеста… Зноў няпэўнасць. Бо незразумела, што ён там убачыў. Няясна, увогуле, ці не падалося яму. Зрэшты, легкадумнасць Ізабэлы не была сакрэтам, але Вакульскі пакідае нібыта няверную прыгажуню і кладзе галаву на рэйкі…

Са сваім героем Прус не зрабіў таго, што Леў Талстой. Пакуты Ганны Карэнінай на тым і скончыліся, а Вакульскі, выратаваны абходчыкам, мусіў цярпець стан роспачы. І чытач разам з героем. З першых старонак — невыносная туга…

«У гэтым хранічным стане, які мучыў мяне так, што і не перадаць, любая драбяза раздзімала буру. Дрэва знаёмай формы, нейкі лысы пагорак, колер воблака, палёт птушкі, нават павеў ветру без ніякай, зрэшты, прычыны абуджалі ва мне такую шалёную роспач, што я ўцякаў ад людзей. Шукаў тады бязлюднага кутка, дзе б ніхто мяне не пачуў, дзе б мог я ўпасці на зямлю і выць ад болю як сабака».

Душэўныя пакуты галоўнага героя «Лялькі» ад пачатку і да канца рамана. Па-польску «пакутаваць» — якраз і будзе «цярпець».

Першым чытачом быў цэнзар

У пакутлівае цярпенне ператварае аўтар жыццё галоўнага героя ў родным краі.

Зрэшты, неспакойны Станіслаў Вакульскі і ў Парыжы. Аўтар вядзе яго па вуліцах французскай сталіцы і адну за адной пералічвае назвы: Лафает, площча Бастыліі… Чытач разумее. Слава Напалеона Банапарта, надзея… Цэнзар не можа пакрэсліць мапу Парыжа.



Баляслаў Прус «Лялька». Варшава. Пераклад на беларускую Галіны Жарко і Міколы Хаўстовіча



Баляслаў Прус (Аляксандр Главацкі)



З 29 верасня 1887 года да 5 мая 1888 года раман «Лялька» друкаваўся ў «Kurier Codziennу»

У самой жа Варшаве, дзе адбываецца дзеянне рамана, стаяла тады расійскае войска, а расійскія чыноўнікі з сем’ямі складалі 3 % насельніцтва. Але ніхто з герояў рамана іх не бачыць, не сустракае на вуліцы, не размаўляе. Яны тут не існуюць. Вакульскі глядзіць са свайго акна і бачыць помнік Каперніка, а побач — Таварыства сяброў навукі, якога даўно ўжо там няма. Гэта аўтар не хоча бачыць перароблены на расійскі манер палац Сташыца з візантыйскімі ўпрыгожаннямі. Першыя чытачы рамана таксама.

Польскія пісьменнікі ўвогуле перасталі заўважаць расійцаў. Гэта быў іх адказ на акупацыю,

на ўзмацненне пасля Студзеньскага паўстання расійскай цэнзуры. Таму рэаліяў жыцця пад акупацыяй у «Ляльцы» няма, а толькі атмасфера прыгнечанасці і нязбыўнай тугі. Вядома, няшчаснае каханне… Нават калі прыгажуня арыстакратка згадзілася ўжо выйсці замуж за купца, таму бачыцца нешта такое, што адчай кідае яго на рэйкі.

Першыя чытачы «Лялькі» сачылі за лёсам герояў, нібы цяперашнія гледачы серыялаў, бо раман рэгулярна, кавалак за кавалкам, друкаваўся ў «Kurier Codzienny», які, зразумела, не мог пайсці ў друк без пячаткі цэнзара.

Слынны пісьменнік Баляслаў Прус зарабляў на жыццё белетрыстыкай і звычайнаю рэпарцёрскаю працаю. А Главацкаму Аляксандру, кім ён быў паводле пашпарта, давялося ў маладосці працаваць гувернёрам, фатографам, слесарам, служыць у банку… Атрымаць вышэйшую адукацыю не хапіла грошай, і на трэцім годзе ён пакінуў Галоўную школу ў Варшаве.

Герой «Лялькі» Вакульскі таксама не давучыўся. Таксама на фізіка-матэматычным факультэце, таксама ў Галоўнай школе. Менавіта так яна называлася. Але цікавая акалічнасць — у рускім перакладзе Вакульскі «бросил университет». Галоўная школа, сапраўды, размяшчалася ў тым будынку, дзе быў Варшаўскі ўніверсітэт, зачынены расійскімі ўладамі пасля 1831 года.

Хто хацеў ва ўніверсітэт, мусіў ехаць у Пецярбург. Гімназіст Аляксандр Главацкі меў такі намер, але не было матэрыяльнай падтрымкі. Бацька і маці памерлі, калі ён быў зусім малы. Зрэшты, яму яшчэ пашанцавала скончыць гімназію, бо ва ўзросце 16 гадоў ён следам за старэйшым братам рушыў у паўстанцы. Да Сібіры праз малады век не дайшло, але былі раненне, расійская няволя, пазбаўленне шляхецтва…

Зноў шматкроп'е…

Баляслаў Прус — таямніца. Нават на фотаздымках ён звычайна ў цёмных акулярах. Яго называюць пісьменнікам без біяграфіі. Удзел у паўстанні як рамантычны парыў маладосці, а потым — звычайнае жыццё. Чаму ж на яго пахаванне 22 мая 1912 года прыйшла ўся Варшава?..

Назаўтра пасля смерці Пруса, 20 мая 1912 года, у цэнтры сталіцы асвячалі гіганцкі праваслаўны сабор з залатымі купаламі, прывезенымі з Масквы. Афіцыйна — храм Аляксандра Неўскага, а па-вулічнаму — «візантыйскі торт», «воданапорная вежа» або яшчэ горш. Варшаўскі рэпарцёр маўчаў. Вечным ужо маўчаннем. Можа, маўчанне, і праўда, здольнае крышыць камень. Міне з дзясятак гадоў, і гэты гмах, які нібы навек паўстаў на Саскім пляцы, знясуць, каб і ўспаміну не было.

Потым у цэнтры зруйнаванай і нанова адбудаванай Варшавы паўстане новы, яшчэ больш высокі гмах — Палац культуры і навукі. Але палац Сташыца, на які глядзеў з акна сваёй кватэры Вакульскі, пазбавіўца дзівачных візантыйскіх упрыгожанняў, верне сваё аблічча і тут, на месцы скасаванага царскімі ўладамі Таварыства сяброў навукі, будзе Акадэмія навук. Далей — на Кракаўскім прадмесці, паблізу крамы купца Вакульскага — Варшаўскі ўніверсітэт… На лекцыях рэгулярна згадваюцца прозвішчы Прус, Вакульскі…



Крама на Кракаўскім прадмесці ў Варшаве



Паўстанцы.
Малюнак французскага мастака



Бой паўстанцаў з расійскім войскам



Высылка ў Сібір

Згадаў Баляслава Пруса ва ўрачыстай лекцыі ў Auditorium Maximum Варшаўскага ўніверсітэта і Адам Паморскі. Лекцыя адбылася якраз напярэдадні афіцыйнай інаўгурацыі ўрачыстасцяў, звязаных з юбілеем паўстання 1863 года, і Адам Паморскі пачаў з жартоўнай скаргі. Ён узначальвае польскі ПЭН-клуб і звяртаўся да знаных асобаў з прапановаю таксама выступіць. «А я супраць паўстання!» — адказвалі яму многія. «Нібы я да ўдзелу ў паўстанні заклікаў іх», — паскардзіўся слынны польскі перакладчык, які перакладае, між іншым, і з беларускае на польскую. З той мовы, на якую, паводле планаў русіфікатараў, усе даўно павінны былі забыцца. Але вось героі «Лялькі» ды сам аўтар — Баляслаў Прус прамаўляюць і замоўчваюць свае таямніцы цяпер і па-беларуску…





Игорь Кузнецов,
кандидат исторических наук

НЕ СОТВОРИ СЕБЕ КУМИРА

До сих пор спорят, кем же был Сталин. Создателем своего культа или личностью, направлявшей ход исторического развития, азиатским деспотом или учителем народов, убийцей или освободителем? Или он был и тем и другим одновременно? А может быть, ни одна из этих оценок не соответствует действительности?

5 марта 2013 г. — 60 лет со дня смерти Сталина

21 декабря 1879 г. в нескольких десятках километров от столицы Грузии в городке Гори в семье Виссариона Ивановича Джугашвили и Екатерины Георгиевны Геладзе родился сын, которого назвали Иосиф. Никто не мог предположить, что пройдут годы и его имя будут произносить с трепетом и содроганием…

5 марта 1953-го, когда Сталина не станет, одни будут плакать от горя, другие — от счастья.

Влиятельный и скрытный

В многочисленных работах, посвященных Сталину, вряд ли найдется вопрос, по которому бы мнения и оценки исследователей совпадали.



Как и многие настоящие революционеры, Сталин был человеком одержимым, но не только идеей революции. Он был одержим мыслью о своем предназначении, о своем призвании. Современники и потомки отмечают его способность навязывать другим свою волю. Но среди членов партии большевиков было много людей с сильной волей, было немало и таких, кто даже в сталинских тюрьмах сохранил свою моральную и физическую стойкость. И трудно сказать, был бы сам Сталин способен на такое в подобной ситуации.

О частной жизни Сталина существует множество легенд. Вспоминают, что он не слишком много времени проводил в кругу своей семьи. Что своих сыновей он тоже не особенно любил. Вообще слово «любовь» в связи со Сталиным можно упоминать только с определенными оговорками.

Достоверно известно, что его старший сын Яков погиб в плену у немцев. Также установлено, что еще до войны, в 1938 или 1939 г., Яков совершил попытку самоубийства, продиктованную отчаянием из-за того, что отец абсолютно с ним не считался. Он выстрелил в себя, но все обошлось только ранением. Однако отец лишь поиздевался над ним. Как пишет Светлана Аллилуева, Сталин заявил, что Яков даже не способен попасть в цель. С сыном от второго брака Василием у Сталина тоже было множество конфликтов. За его детством, которое не знало родительской ласки, последовала безответственная и неудачная взрослая пора.

К своей дочери Светлане Сталин относился с восторженной любовью. Впоследствии восторги прошли, но любовь осталась. Видимо, Светлана была единственным человеком, к которому Сталин питал теплые чувства. Он мог в ее присутствии даже расчувствоваться, проявить себя человеком, который нуждается в любви и нежности.

Таким он предстает в письмах, посланных ей. *«Моя дорогая Сетанка, я получил твое письмо от 25 октября. Спасибо, что ты не забыла своего папку. У меня все в порядке, я чувствую себя хорошо, но скучаю без тебя. Получила ли ты персики и гранаты? Я пошлю тебе еще, если ты мне прикажешь. Попроси Васю, чтобы он мне тоже написал. До свидания. Крепко тебя целую. Твой папка».*

Сталин, однако, вообще не терпел, чтобы сияние власти, исходящее от него, каким-то образом затрагивало тех, кто стоял рядом с ним, его родственников или членов семьи. От таких людей он постепенно освобождался. Существует версия того, как он расправился с братом своей первой жены Е. С. Сванидзе. Этому человеку, сидевшему в тюрьме, сообщили, что если он попросит прощения у Сталина, то его отпустят на свободу. Однако свояк не согласился. Когда об этом доложили Сталину, то он отреагировал следующим образом: *«Какой гордый! Решил умереть, но не просить прощения».*

Сталин по своей натуре избегал людей. Среди приближенных сотрудников многие отмечали его гнетущее влияние на них. Сталин всегда стремился замаскировать свои поступки, скрыть свою роль в руководстве машиной террора.

«Большой террор»

Если бы применение репрессивных методов было отличительным свойством именно И. В. Сталина, а не *обязательным* атрибутом диктаторской формы правления в любой стране, то тогда действительно психологии (или психиатрии) принадлежала бы заглавная роль в изучении «культа личности». Однако именно строгая повторяемость основных составляющих «культа личности» (при разных масштабах и формах, включая и репрессии) свидетельствует в пользу безусловного приоритета социального анализа.

С точки зрения личных эгоистических интересов И. В. Сталина — «великого стратега социализма», «гениального вождя мирового пролетариата», «испытанного, мудрейшего и любимого вождя» (все определения взяты из стенограммы XVII съезда) — репрессии эти логичны, естественны, необходимы и объясняются без труда.

С точки зрения психологической сущности И. В. Сталина как индивида они тоже объяснимы, хотя трудно сказать, что именно было главным. Может быть, превалировал комплекс органического эгоцентризма, когда общество и

его интересы целиком отождествляются с собственной персоной? Может, это был бесчеловечно холодный, далеко идущий расчет властолюбца? Может быть, сыграли свою роль элементарная трусость и предрасположенность к параноидальной подозрительности, исходившей из вполне реальной угрозы его положению? Как бы там ни было, но индивид мещанского, мелкобуржуазного склада в своих интересах — личных, эгоистических, эгоцентрических — «оседлал» историю, всячески стараясь упрочить свое положение.





В 1937–1938 гг. Сталин второй раз за время своего властвования (первый — во время голода 1932–1933 гг.) устроил, руководствуясь прямым личным «культовым» интересом, грандиозное, массовое, целенаправленное и планомерное человекоистребление. Он провозгласил *защиту* социализма от его врагов важнейшим идеологическим направлением, но действовал как злейший и коварнейший враг этой общественной системы, уничтожив сотни тысяч лучших, в большинстве своем искренних сторонников и строителей социализма, выстрадавших идею и на царской каторге, и в огне гражданской войны, в тифу, холоде и голоде восстановления экономики, в бессонных ночах пятилеток... Именно этих людей И. В. Сталин и его окружение попытались представить в качестве «врагов народа».

Никакой «белый террор», никакая война не смогли нанести такой урон коммунистической партии, коммунистическому движению, какой нанес, защищая свою личную абсолютную власть, «гениальный вождь мирового пролетариата». Впрочем, ответственность за это массовое истребление людей несет отнюдь не он один, ибо не бывает «культа» без пирамиды «культов», без массы бездумных, на все готовых маленьких, тиражированных копий «великого вождя», без лишенных моральных тормозов исполнителей, без трусливо и молчаливо воспринимающих «культ» и все его деяния (включая репрессии) широких масс людей.

Несостоятельными, на мой взгляд, являются часто мелькающие в печати объяснения массовых репрессий исключительной мстительностью И. В. Сталина, сведением им личных счетов, равно как и копирующими его В. М. Молотовым, Л. П. Берией, К. Е. Ворошиловым, Л. М. Кагановичем, Г. М. Маленковым, А. А. Ждановым и др. Всегда можно уничтожить (морально, физически или политически) конкретно одного, другого, третьего... Для этого всегда было достаточно «нормальных» для любой тирании, вполне благовидных способов: авто- или авиакатастрофа, неудачная операция, отравление пищей... Однако невозможно объяснить элементарным сведением счетов уничтожение миллионов своих сограждан, 99 % которых ни сам И. В. Сталин, ни его окружение не только не знали, но и знать не могли.

Целенаправленным и адресным можно признать уничтожение примерно половины делегатов XVII съезда (репрессировано было 1108 из 1966 делегатов и 98 из 139 членов и кандидатов в члены ЦК, избранных на съезде). Но уничтожение миллионов людей имело общеполитическую направленность, репрессии носили не узколичный и отнюдь не бессистемный, а именно *политический* характер.

Кроме того, открытые процессы — по ним, как правило, проходили бывшие деятели различных оппозиционных течений — должны были отвлечь внимание от идущего втихомолку массового уничтожения принципиальных, честных коммунистов, государственных, хозяйственных руководителей.

Процесс над М. Н. Тухачевским позволил легализовать (не начать, а именно легализовать) волну террора против высшего, а частично и среднего комсостава и политработников Красной Армии. Фактически репрессии начались раньше, но после процесса они развернулись в полную силу. Командный состав армии был настолько оголен (было репрессировано более 40 тыс. человек), что после войны с Финляндией зимой 1939–1940 гг., показавшей, что за два года репрессий и связанной с ними дезорганизации армия скатилась из передовых в отсталые, пришлось вернуть в строй какую-то часть подвергнутых репрессиям военных. Тех, кого не успели расстрелять. А расстреляли практически всех в звании командира корпуса и выше.

В марте 1938 г. прошел последний открытый процесс, по которому на основании фальсифицированных обвинений судили Н. И. Бухарина, А. И. Рыкова, Н. Н. Крестинского, Х. Г. Раковского, В. И. Иванова, А. П. Розенгольца, М. А. Чернова, Г. Ф. Гринько, И. А. Зеленского и др.



Стреляные гильзы револьвера системы Нагана. Куропаты. 1987 г.

Нелепость предъявленных им обвинений при современном прочтении стенограммы процесса настолько очевидна, что не приходится говорить о каких-либо заблуждениях или ошибках организаторов репрессий и их непосредственных исполнителей (среди которых первую роль наряду с В. В. Ульрихом играл прокурор А. Я. Вышинский).

Главным образом на вторую половину 1937 г. и на 1938 г. приходились так называемые

«маскирующие» репрессии, когда за счет арестов и расстрелов на местах первых попавшихся создавалась видимость всеобщего распространения вражеской деятельности. Управление НКВД по той или иной республике, как свидетельствуют источники, получало разнарядку на выявление определенного, заданного числа «врагов народа». Разными путями, в том числе и с использованием заблаговременно накопленных доносов, срочно полученных новых «направленных» показаний от арестованных раньше и т. п., составлялся список конкретных людей «под разнарядку» ареста.

Надо отметить, что в общий список обозначенных в разнарядке лиц, подлежащих репрессиям, сразу включалось и число (именно число, а отнюдь не фамилии) тех, кто должен быть расстрелян. Перевыполнить «норму» разрешалось, но ее недовыполнение строго наказывалось. Поэтому широко бытовала практика, когда арестованных тут же, в «подходящем месте» (лесу, овраге и т. п.) расстреливали, а потом, задним числом, оформляли дело с обвинениями, признательными показаниями, решениями особого совещания или «тройки»... Демографическая репрезентация в такого рода репрессиях чаще всего обеспечивалась «сама собой».



В 1939–1940 гг. волна репрессий заметно спала — просто уже совсем немного осталось тех, кто был их конечной целью. Однако и тут, уже при Л. П. Берии, сменившем Н. И. Ежова, аресты и расстрелы (в том числе в лагерях) не были единичными и не носили случайный характер.

Чудовищная жестокость при проведении репрессий 1937–1938 гг. (да и в последующие годы) ни в какой мере не может быть объяснена какими-то чертами характера И. В. Сталина, его собственным садизмом и жестокостью исполнителей (начиная от Ягоды, Ежова и Берии и заканчивая рядовыми следователями). Объяснение этой жестокости кроется в характере целей, которые реализовывались в ходе этих репрессий.

Репрессии были направлены прежде всего и главным образом против истинных и честных по отношению к идее коммунистов. Именно они составляли главную угрозу «культу личности». Многие из них прошли через допросы царских следователей, прокуроров. При нормальной следственной процедуре (даже при тех относительно умеренных формах давления на подследственных, которые применялись в 1920-е — начале 1930-х гг.) они никогда не приняли бы сочиненную для них сталинскими следователями версию их страшной вины. Их надо было «подвести» к смертному приговору, ведь только за одно скептическое отношение к И. В. Сталину (да и оно ведь было далеко не у всех) расстреливать было нельзя.

Поэтому оставался только один путь — «вколотить» в них любые, самые фантастические признания: в терроре, шпионаже, сознательном вредительстве и т. п. И при этом сделать их существование в тюрьме настолько невыносимым, чтобы они сами согласились и на эти признания, и на следовавшую за этими показаниями неизбежную смерть. В НКВД людей заставляли сознаться в том, чего заведомо не было и быть не могло. И что ничего этого не было, следователи знали лучше, чем подследственные.

Сочиненные малограмотными, не наделенными литературным талантом следователями НКВД «законные основания», все эти «заговоры» и «антисоветские организации» выглядят сегодня настолько убого, что обнаружить грубейшую фальсификацию предъявленных подследственным обвинений не составляет особого труда. Но ведь это, с позволения сказать, «литературное творчество» стоило жизни миллионам ни в чем не повинных людей!



Действия И В. Сталина, его окружения, его ближайших подручных не снимают вины и с более «мелких», в большинстве своем пока все еще «безымянных» лейтенантов и майоров НКВД. Поэтому наши представления о «культе личности» будут неполными до тех пор, пока не будут достаточно детально изучены социология, психология, различные мотивы действий следователей НКВД и МГБ, которые побуждали их к фальсификациям и кровавому ремеслу.

Подсудный список

Теперь о количестве жертв террора. Директор департамента по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Беларуси Владимир Адамушко в 1993 г. назвал цифру: в Беларуси судебными и несудебными органами, а также в административном порядке было репрессировано около 600 тыс. человек. Но эту цифру сложно назвать официальной, поскольку она не была заявлена от имени государства, от имени Института истории Национальной академии наук.

По подсчетам автора, число репрессированных в Беларуси составляет примерно 1,6–1,8 млн человек.

Если мы добавим тех, кто жил в состоянии страха, тех, кто испытывал унижение из-за того, что его не принимали на работу или увольняли, потому что отец или мать были арестованы как «враги народа», цифру можно увеличить.

Палачи, которые добросовестно осуществляли аресты, а затем и расстрелы своих соотечественников, впоследствии тоже получали пулю в затылок от своих и в тех же Куропатах...

Точных данных о количестве расстрелянных в Беларуси нет и не будет. В последние годы были отдельные попытки эту тему каким-то образом раскрыть, даже не со стороны независимых СМИ, где она довольно часто фигурирует. В 2008 г. режиссер Анатолий Алай снял документальный фильм «Пантелеймон Пономаренко». Во время съемок в Москве он встречался с ведущими сотрудниками российских архивов. И они привели такую цифру: когда наркомом НКВД БССР был Борис Берман (это как раз 1937 г.), то в Минске за один год было расстреляно 80 тыс. человек. Значит, 80 тыс. человек казнили только за один год, в то время как, согласно официальным данным, с 1917 по 1953 г. вообще жертвами «Большого террора» стали не более 35 тыс. человек.

Но кроме Минска расстреливали еще не менее чем в 45 населенных пунктах страны. И в Минске, кроме Куропат, еще не менее восьми мест расстрелов.

В Куропатах проводилось две эксгумации расстрелянных: в 1988 и 1997–1998 гг. Из около 500 захоронений эксгумировали только 18, но даже в результате этого был сделан вывод, что минимальное количество расстрелянных в Куропатах — не менее 30 тыс. человек. Историки называют и 100, и 150 тыс. расстрелянных, говорят и о 250 тыс. жертв в Куропатах. Какие данные близки к

истине, выяснить сегодня все еще не возможно: КГБ Беларуси информации не дает. На все вопросы «неподведомственных» исследователей следует ответ: документов нет, никакими сведениями не располагаем.

Не следует забывать и тот факт, что в период массовой коллективизации в Беларуси в 1929–1932 гг. более 250 тыс. местных крестьян были высланы в глубь СССР, в необжитые районы Казахстана и Сибири. И многие наши соотечественники умерли там от голода и холода.

Еще существует проблема так называемых вторичных репрессий. Когда в 1937 г. началась новая волна террора, в ссылке находились белорусы, репрессированные в 1933–1934 гг. Кого в первую очередь пускали под расстрел в отдаленных районах по новым разнарядкам? Не местных жителей, а тех, кто был выслан, кого вторая волна репрессий 1937–1938 гг. застала в Томской, Кемеровской, Новосибирской областях, на Колыме и на Дальнем Востоке.



Куропаты. 1987 г.

И мы не знаем, сколько там погибло: в архивно-следственных делах, которые хранятся в КГБ Республики Беларусь, зафиксирован только факт того, что человек был осужден, допустим, на десять лет лагерей. Но что с ним дальше произошло, расстреляли его в 1937 г. или он остался жив — таких сведений нет.

Репрессии в Беларуси в 1938 г. не завершились. Они активно возобновились в 1939-м. Например, в ходе четырех депортаций, которые были проведены с осени 1939 г. по 22 июня 1941 г., из Западной Беларуси было депортировано в Сибирь, Казахстан, на Дальний Восток около 120 тыс. человек. Некоторые исследователи считают эту цифру заниженной, потому что здесь учтены только те, чьи фамилии документально засвидетельствованы. Но ведь сотни и тысячи жителей Западной Беларуси были депортированы без включения в какие-либо списки.

Мы можем только предполагать, что среди жителей Западной Беларуси цифра расстрелянных в этот период составляет не менее 30 тыс. человек, а количество пострадавших от репрессий — не менее 300 тыс. человек, или около 10 % населения Западной Беларуси.

По официальной статистике, пострадавшими от репрессий считаются те, кто был осужден судебными и несудебными органами, судами, военными трибуналами, а также в административном порядке. Но сюда следует отнести и тех, кого по какому-либо социальному признаку не принимали в партию, комсомол, на работу, кого увольняли, т. е. тех, у кого были расстреляны или арестованы родственники, членов семей «изменников родины» и «врагов народа». Действия по отношению к ним — это психологические репрессии, унижение их человеческого достоинства, и сложно подсчитать, сколько людей от этого пострадало.

Особое место в системе преступлений сталинизма занимает «катынское дело». Россия еще в начале 1990-х гг. передала польской стороне документы, касающиеся трагических событий в Катыни весной 1940 г. Белорусские власти продолжают повторять, что к катынской трагедии здешние чекисты не имеют отношения.

Но известно решение ЦК ВКП (б) от 5 марта 1940 г., где предписывалось «дела о находящихся в лагерях для военнопленных 14 700 человек бывших польских офицеров, чиновников, помещиков, полицейских, разведчиков, жандармов, осадников и тюремщиков, а также дела об арестованных и находящихся в тюрьмах западных областей Украины и Белоруссии в количестве 11 000 человек членов различных шпионских и диверсионных организаций, бывших помещиков, фабрикантов, бывших польских офицеров, чиновников и перебежчиков — рассмотреть в особом порядке, с применением к ним высшей меры наказания — расстрела».

Был приказ Берии от 22 марта 1940 г. «О разгрузке тюрем НКВД УССР и БССР», в котором предписывалось польских офицеров и полицейских из тюрем Пинска, Бреста, Вилейки, Барановичей общим количеством около 3 тыс. человек отправить в Минск. Здесь они, вероятно, и были расстреляны. Есть свидетельства, что расстрелы офицеров польской армии по «белорусскому катынскому списку» проводились около Гродно, Бреста, Волковыска, Барановичей.



Череп неизвестного с кляпом в зубах. Куропаты. 1997 г.

Россия и Украина обнародовали списки расстрелянных. Беларусь этого не сделала. По подсчетам исследователей, не менее 3870 офицеров польской армии было уничтожено на белорусской территории. Причем когда мы говорим о «белорусском катынском списке», то следует иметь в виду, что среди репрессированных были в основном офицеры запаса, призванные на службу с началом Второй мировой войны. Многие из них являлись белорусами, украинцами, евреями, русскими, проживавшими в то время на территории Западной Беларуси.

Одно из установленных мест расстрелов — в районе города Глубокое. С началом военных действий на территории Беларуси в 1941 г.



проходила эвакуация тюрем. По показаниям свидетелей, уголовников эвакуировали в глубь страны, а офицеров польской армии, которых по неизвестным причинам не расстреляли весной 1940 г., уничтожили 25 июня 1941 г. при подходе немецких частей.

Белорусская власть до настоящего времени категорически отрицает факт этого военного преступления. Но, несмотря на противодействие власти, преступления сталинизма никогда не будут преданы забвению в Беларуси. Вот только ничего не изменится, пока народ сам не осознает глубину трагедии, которая сопровождалась огромными людскими потерями в 1920–1950 гг.

Личная вина

Репрессии стали обязательным условием функционирования государственного механизма, неоправданно жестоким рычагом экономического, политического и идеологического управления, обязательным элементом «культа личности», что привело к уродливой деформации социализма. Но в последующие годы сталинизма масштабы и характер репрессий все же изменились: они приняли преимущественно *индивидуально направленный* характер, механизм «чистки» был заменен механизмом «устрашения» — одним из главных факторов эффективности управления в системе «культа».

После репрессий 1937–1939 гг. «культ личности», персонифицированный И. В. Сталиным, достиг своего зенита. Положение «великого вождя всех времен и народов» отныне стало исключительным. На XVIII съезде ВКП(б) приветствия Сталину заняли уж очень значительную часть времени в работе съезда. Кто-то при этом был искренен, кто-то попросту боялся за свою жизнь и «прогибался», но овации и приветственные крики возникали в зале каждый раз, когда хоть в какой-либо связи произносилось имя вождя. Портреты его в те годы были вывешены во всех возможных (и невозможных) местах. Идолопоклонническое отношение к самому имени Сталина или его изображению обрело статус жестко и жестоко охраняемой правовой нормы.

Невзрачный, нелюдимый, одержимый непомерным тщеславием, недоучившийся семинарист Сосо Джугашвили, когда-то, в далекие 90-е гг. XIX века, «поставивший» в своей личной жизненной карьере на революцию, в конце концов добился своего. К своему 60-летию он стал единоличным властителем Советской России, обладавшим такой полнотой власти, которая не снилась даже самым деспотичным императорам. Он стал более чем властителем, вместо того чтобы стать скромным священником, служителем Христа, каким его хотела видеть мать и каким пытался сделать его духовный наставник в далекие семинарские годы. Он сам стал живым «богом»...

Его тень до сих пор блуждает по лабиринтам людских судеб и поколений. Еще немало ныне живущих людей ностальгируют по отошедшему в историю СССР, хотя знают, что там были репрессии и расстрелы, ссылки и психушки для неугодных.

Убежден, что пока в Беларуси не состоится «Нюрнберг-2» по рассмотрению и осуждению злодеяний сталинизма, преступное прошлое будет всегда рядом, его зловещее дыхание в любую минуту может ощутить каждый из нас.

10 фактаў пра смяротнае пакаранне ў Беларусі



Таццяна ГУСЕВА,
www.gazetaby.com

Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе і на постсавецкай прасторы, дзе прыводзяцца ў выкананне смяротныя прысуды. «Салідарнасць» высвятляла, як змянілася стаўленне да гэтага беларусаў, колькі чалавек было асуджана цягам апошніх 20 гадоў і каго адзінага памілаваў кіраўнік дзяржавы.

1. 1996 год: на рэферэндуме па пытанні смяротнага пакарання дэбютавала Ярмошына

Смяротнае пакаранне ў Беларусі было ўзаконена на рэферэндуме ў лістападзе 1996 года. Паводле афіцыйных дадзеных ЦВК, супраць адмены смяротнага пакарання выказаліся 80,44 % ад ліку тых, хто меў права ўдзельнічаць у рэферэндуме. «Наколькі афіцыйным дадзеным можна давяраць — асобнае пытанне. Тым не менш варта адзначыць, што гэты рэферэндум — дэбют Лідзіі Ярмошынай на пасадзе старшыні ЦВК», — нагадваецца ў аналітычным матэрыяле Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (зарэгістраваны ў Вільнюсе).

Праз 16 гадоў пасля рэферэндуму былы старшыня Канстытуцыйнага Суда і генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч у інтэрв'ю «Еўрарадыё» заявіў:

— Рашэнне таго рэферэндуму насіла кансультацыйны характар, і, у прынцыпе, можна вырашыць інакш. Але і кіраўнік дзяржавы, і парламент — яны прадстаўляюць народ. І меркаванне грамадзян для іх мае важнае значэнне, якое ўплывае на прыняцце імі рашэнняў.

2. Сацыёлагі: 40,7 % беларусаў за адмену смяротнага пакарання

Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў з 2008 года рэгулярна праводзіць апытанне дзеля высвятлення стаўлення беларусаў да смяротнага пакарання.

У верасні 2012-га былі апытаны 1502 рэспандэнты ад 18 гадоў і старэйшыя метадам face-to-face. Памылка рэпрэзентатыўнасці не перавышае 0,03 %.

Цікава, што сярод тых, хто выступае супраць адмены смяротнага пакарання, 57,3 % падтрымліваюць Аляксандра Лукашэнку.

Як адзначаецца ў аналітычным матэрыяле НІСЭПД, праблема захавання смяротнага пакарання знаходзіцца на перыферыі грамадскага меркавання. У чэрвені 2012-га толькі адзін рэспандэнт уключыў яго ў спіс самых важных праблем, якія мусіць вырашаць урад Беларусі.

3. Лукашэнка: «Я ніколі сам не пайду на ўвядзенне мараторыя»

Звяртаючыся са штогадовым пасланнем парламенту і народу ў траўні 2012 года, Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанне дэпутата Самасейкі пра магчымасць увядзення мараторыя на смяротнае пакаранне.

— Я ніколі сам не пайду на ўвядзенне мараторыя, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я ведаю настроі людзей.

Са слоў Лукашэнкі, ён як прэзідэнт павінен зрабіць так, як хоча грамадства:

— Калі ты — гад і нягоднік і ідзеш на злачынства, будзь гатовы за яго адказаць. Хаця, можа быць, грамадства падышло да мараторыя.

Неаднойчы кіраўнік дзяржавы і прадстаўнікі ўлады спасылаліся на рэферэндум, згодна з якім «большасць грамадзян краіны выказалася за захаванне дадзенай меры пакарання». На прэс-канферэнцыі ў снежні 2011-га Лукашэнка запэўніў журналістаў, што «ўсе прысуды да смяротнага пакарання праходзяць праз яго сэрца». Ён нагадаў, што матэрыялы па гэтых крымінальных справах кладуць на ягоны стол.

— Я заўсёды патрабую, каб было прыкладзена, за што чалавека асуджаюць да выключнай меры.

Як адзначыў Лукашэнка, да дакументаў абавязкова далучаюць фатаграфіі.

— Мне страшна становіцца... Узломліваюць кватэру, забіваюць усю сям'ю, гвалтуюць малалетніх дачок, потым разразаюць, прабачце, на кавалкі, кідаюць у ванну і сыходзяць. Іх потым затрымліваюць, даюць 25 гадоў... У мяне, як і ў вас, пачуццё адно: вось іх бы на кавалкі пасекчы так і ў ванну. ...Калі ёсць хоць найменшая зачэпка, што гэта, можа быць, не зусім дакладна... Ён атрымлівае пажыццёвае зняволенне... Так якія могуць быць да нас прэтэнзіі?

4. Каго памілаваў Лукашэнка

У праваабаронцаў выклікае занепакоенасць закрытасць вынікаў дзейнасці Камісіі па пытаннях памілавання і рашэнняў прэзідэнта па справах асуджаных да смяротнага пакарання.

На дадзены момант вядома толькі адно рашэнне прэзідэнта аб памілаванні асуджанага на смяротнае пакаранне. Дзмітрый Хархаль правёў у камеры смяротнікаў у мінскім СІЗА больш за год. У чэрвені 2003-га яму замянілі смяротны прысуд пазбаўленнем волі тэрмінам на 15 гадоў.

Дзмітрый расказаў свайму адвакату, што, пакуль ён знаходзіўся ў камеры смяротнікаў, турэмныя наглядчыкі білі яго. Прычым пасля кожнага збівання, са слоў адваката, прымушалі Хархаля гаварыць «вялікі дзякуй»...

Заявы аб жорсткім абыходжанні ўлады не расследавалі.

5. Колькі смяротных прысудаў было выканана, грамадскасці невядома

— Жахлівасць смяротнага пакарання не толькі ў тым, што дзяржава забівае людзей, а яшчэ і ў той таямніцы, якая робіцца з самога выканання гэтых прысудаў, — гаворыць каардынатар кампаніі «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання» Андрэй Палуда.

Праваабаронцы сведчаць, што вядомая статыстыка толькі вынесеных смяротных прысудаў.

З 1990 па 2011 год да выключнай меры пакарання ў Беларусі былі асуджаны 324 чалавекі.

Паводле звестак Дэпартамента выканання пакаранняў МУС, за апошнія гады колькасць смяротных прысудаў паменшылася. Напрыканцы 90-х гадоў суды выносілі па 30–40 смяротных прысудаў штогод. У 2000-я сітуацыя выглядала наступным чынам: 2001 год — 7 прысудаў, 2002 год — 4 прысуды, 2003 год — 4, 2004 год — 2, 2005 год — 2, 2006 год — 9, 2007 год — 4, 2008 год — 1, 2009 год — 2, 2010 год — 1, 2011 год — 2.

6. За што ў Беларусі асуджаюць на смерць

Згодна з Крымінальным кодэксам, смяротнае пакаранне можа прызначацца за падрыхтоўку і вядзенне агрэсіўнай вайны (арт. 122), тэрарыстычны акт супраць прадстаўніка іншай дзяржавы (арт. 124), міжнародны тэрарызм (арт. 126), генацыд (арт. 127), злачынствы супраць бяспекі чалавецтва (арт. 128), выкарыстанне зброі масавага паражэння (арт. 134), парушэнне законаў і звычаяў вайны (арт. 135), забойства (арт. 139), тэрарызм (арт. 289), здраду дзяржаве (арт. 356), змову ці іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады (арт. 357), тэрарыстычны акт (арт. 359), дыверсія (арт. 360), забойства супрацоўніка міліцыі (арт. 362).

Смяротнае пакаранне не можа быць прызначана асобам, якія ўчынілі злачынствы ва ўзросце да 18 гадоў, жанчынам і мужчынам, якія дасягнулі да дня вынясення прысуду 65 гадоў.

7. Маці смяротніка пахавала на могілках рэч свайго сына

На ўсе звароты ў Міністэрства ўнутраных спраў родныя расстраляных асуджаных атрымлівалі адказы з Дэпартамента выканання пакаранняў: «Згодна з пунктам 5 артыкула 175 Крымінальнага кодэкса, целы пасля смяротнага пакарання родным не выдаюцца і месца пахавання не паведамляецца».

Родным не паведамляюць і дату расстрэлу, а ў пасведчанні аб смерці ў графе «прычына смерці» ставяць прочырк.

— Паколькі дзяржава старанна хавае такую інфармацыю, гэта спараджае легенды пра тое, што смяротнікаў разбіраюць на органы ці што яны працуюць на ўранавых рудніках. Хоць ніхто пра такія руднікі ў Беларусі не чуў, — адзначае Андрэй Палуда.

Блізкія і сям'я пакаранага пазбаўлены магчымасці пахаваць роднага чалавека і потым наведваць яго магілу.

Як расказаў «Салідарнасці» Андрэй Палуда, маці аднаго смяротніка пахавала на могілках рэч, якая належала яе сыну, і паставіла помнік, каб было дзе яго памянуць.

Калі асуджаны да смяротнага пакарання здзяйсняе самагубства, памірае праз хваробу ці яго забіваюць у турме, яго цела выдаюць сваякам для пахавання.

Былы начальнік мінскага СІЗА Алег Алкаеў у інтэрв'ю Amnesty International узгадаў, як аднойчы ў камеры апынуліся два асуджаных на смяротнае пакаранне. Дзяжурны позна заўважыў, што адбываецца, і не паспеў іх выратаваць. Целы самазабойцаў былі перададзеныя родным за два дні да даты, на якую было прызначанае выкананне прысуду.

8. Да смяротнага пакарання прыгаварылі непісьменнага

У 2009 годзе суд асудзіў да смяротнага пакарання 30-гадовага жыхара Драгічынскага раёна Васіля Юзэпчука, які быў прызнаны вінаватым ва ўчыненні серыі забойстваў пажылых жанчын.

Асуджаны накіраваў хадайніцтва аб памілаванні прэзідэнту. Ён прасіў захаваць яму жыццё, настойваючы на тым, што ў будучым могуць з'явіцца абставіны, якія пацвердзяць яго невінаватасць. Калі ж прысуд будзе выкананы, то ў выпадку выяўлення памылкі выправіць яе будзе немагчыма.

Па меркаванні адвакатаў, што выступалі ў судовым пасяджэнні па справе Юзэпчука, прысуд Брэсцкага абласнога суда будаваўся на здагадках, бо прамых доказаў не было.

— У аснову абвінаваўчага прысуду былі пакладзеныя галоўным чынам сведчанні супрацоўнікаў міліцыі, — расказаў «Салідарнасці» Андрэй Палуда. — Ёсць факты, якія сведчаць, што Юзэпчуку падчас знаходжання ў следчым ізалятары наносіліся цялесныя пашкоджанні, што было зафіксавана. Таксама, паводле заключэння камісіі экспертаў, у асуджанага лёгкая ступень разумовай адсталасці, ён кепска арыентуецца ў наваколлі, непісьменны. Таму існуе вельмі сур'ёзная заклапочанасць наконт таго, што віна асуджанага да смяротнага пакарання не даказаная належным чынам.

Палуда ездзіў у вёску, дзе жыў Васіль Юзэпчук і дзе дагэтуль жывуць ягоныя сваякі.

— Ён са шматдзетнай цыганскай сям'і. Умовы пражывання жахлівыя. Жывуць тым, што просяць міласціну. Сам Вася грамаце, па вялікаму рахунку, пачаў вучыцца ўжо за кратамі, калі сядзеў у адной камеры з Андрэем Жуком. Па сутнасці, сукамернік, таксама асуджаны да смяротнага пакарання, і стаў для Васі настаўнікам.

Не ведаю, як Юзэпчук распісваўся ў пратаколах падчас следства. Мабыць, крыжыкам, альбо навучылі пісаць слова «Вася».

...Пасля расстрэлу Юзэпчука ў Кобрынскім раёне забойствы пенсіянерак працягнуліся. Іх пазбаўлялі жыцця тым самым спосабам, якім, як вырашыў суд, забіваў Васіль.

9. «Перад тым, як здарылася забойства, гаспадар кватэры шэсць разоў выклікаў міліцыю. Ніхто не прыехаў»

У 2010 годзе Гарадзенскі абласны суд прысудзіў да вышэйшай меры пакарання Андрэя Бурдыку і Алега Грышкаўцова.

Іх прызналі вінаватымі ў забойстве трох чалавек: 65-гадовага гаспадара кватэры, яго нявесткі, з якой у Бурдыкі быў раман, і нявесткавай прыяцелькі. Жанчыну забілі з рэўнасці, усіх астатніх — як сведкаў.

На працягу тыдня да забойства Бурдыка і Грышкаўцоў пілі. Напярэдадні трагедыі пажылы гаспадар кватэры спрабаваў суцішыць нявестку і яе сяброў, якія ўчынілі скандал. Ён шэсць разоў тэлефанаваў у міліцыю і прасіў прыехаць. Але ніхто не прыехаў. Пасля, падчас судовага разбору, высветліцца, што гэтыя шэсць званкоў нават не былі зафіксаваныя дзяжурнымі ў журнале.

На думку маці Андрэя Бурдыкі, забойства магло б і не здарыцца, калі б з боку праваахоўных органаў за яе сынам быў нагляд.

— Андрэя выпусцілі з калоніі, замяніўшы астатні тэрмін на папраўчыя работы. Але адзначацца ніхто не патрабаваў, — расказвала жанчына праваабаронцам закрытага на сёння цэнтра «Вясна». — Ні разу за гэтыя паўтары месяцы, якія ён быў на волі, ніхто не пацікавіўся, не патэлефанаваў, не пракантраляваў. Калі б ён ведаў, што з 22.00 да 7.00 ён павінен знаходзіцца дома, магчыма, гэтага б не здарылася.

— Зразумела, усё гэта не апраўдвае забойцаў, — лічаць праваабаронцы. — Але і смяротнае пакаранне не вырашае праблемы. Беларускія ўлады апелююць да таго, што менавіта смяротнае пакаранне з'яўляецца фактарам стрымлівання. Але гэта не так. П'яны чалавек у стане агрэсіі не здольны думаць пра тое, што за зробленае яго пакараюць смерцю.

10. Лісты з камеры смяротнікаў

Праваабаронца Ірына Тоўсцік ліставалася з Андрэем Жуком, асуджаным за забойства дваіх інкасатараў СВК «Бальшавік-Агра», якія перавозілі грошы для выплаты зарплат працаўнікам сельгаспрадпрыемства.

— Гэта была кароткая перапіска, якая спынілася пасля яго хуткага расстрэлу, — узгадвае Ірына. — У сваіх лістах Андрэй Жук разважаў пра межы справядлівасці смяротнага пакарання. Прыводзіў прыклады, калі аднаму за падобнае злачынства прысудзілі 25 гадоў зняволення, другім — пажыццёвае, а яму — расстрэл. Тым не менш Андрэй трымаўся даволі стойка, ведаючы пра вынесены яму смяротны прысуд, але ён сябе не апраўдваў і гатовы быў панесці любое пакаранне. У яго засталося двое дзяцей. Малодшага, які нарадзіўся, калі ён сядзеў у турме, Андрэй не бачыў. Пісаў, што, каб думаў пра дзяцей і сям'ю, ніколі б злачынства не рабіў, ды і не планаваў нікога забіваць, відаць, са страху...

З ліста Андрэя Жука: «Міністр юстыцыі, выказваючы свой пункт гледжання за захаванне смяротнага пакарання гаворыць, што, разглядаючы гэтае пытанне, можна спытаць, як лічаць родныя загінулых. Эмоцыі, помста — гэта не правасуддзе. У такім выпадку і суды не патрэбныя. Хай дадуць тым самым сваякам у рукі зброю і суд Лінча...»





Дарья Лис

Лирика белорусского полустанка востребована российскими поп-звездами

Ольга Ровная:

«Мы все время ждем удара в спину. А хочется улыбок»

Бывают же такие истории! Девочка из белорусской деревни Залесье (недалеко от Сморгони) мечтает стать журналистом, печатается в местной газете, заканчивает школу с золотой медалью, потом резко увлекается прикладной математикой… Но поступает на филфак педагогического университета. Белорусский и польский языки. Стихи. Публикации в «Студэнцкай думцы» (и не только). Переводы. Работа няней. Стихи…

Песни на ее стихи поют белорусские и российские эстрадные звезды и звездочки. Ольга Ровная — неоднократный лауреат музыкальных фестивалей «Песня года» и «Новые песни о главном». Кажется, иди себе дальше по успешной тропинке, получай «Золотые граммофоны» (и не только). И вдруг — астрология, астропсихология и массаж аметистами (и не только). Значит, так звезды совпали? Совпали, но уже за пределами Беларуси.

— Оля, что тебя заставило уехать из Беларуси?

— Просто мне предложили работу… И я встретила людей, очень близких мне по мировоззрению. За месяц собрала вещи и уехала. Постигать иные места меня тянуло с детства. В шесть лет я поехала в путешествие. На велосипеде. На полпути к дальним странам меня остановили дождь и одна из бабушек. Почувствовала неладное, наверное. (*Улыбается.*)

— Ты с детства знала, что уедешь из Залесья?

— Да, я когда в первый раз увидела поезд, поняла, что именно он меня увезет… Нет, больше всего я люблю лошадей и велосипеды, но так не преодолеешь большие расстояния… Самолеты тяжело переношу… Летаю, конечно, но… Я земной, наземный человек! А лошадей люблю с детства, у моего дедушки были лошади…

Два года назад, уже в Москве, я решила, что хватит самодеятельности, это опасно все-таки. Занялась верховой ездой с инструктором. Правда, дурная кровь гуляет, и шлем я купила только через год. Но все прошло без травм… Зимой я не езжу верхом — танцую. Танцы латиноамериканские, сальса и бачата. Сейчас я не просто учусь танцевать, а целенаправленно готовлюсь поехать в байло-тур на Кубу. Ты едешь как турист, но не столько смотришь окрестности, сколько занимаешься танцами с местными учителями.

— Танцевальное «паломничество»?

— Да, готовлюсь освоить нюансы танца на местности, напитаться колоритом. Еду с достаточно хорошо подготовленными танцорами, появилось много друзей-кубинцев. Куба — маленькая страна, но она разбросала танцоров по всему свету… И зачастую это люди с высшим хореографическим образованием. Стихийно учу испанский. Я легче отдельных слов запоминаю куски текста с цельным смыслом… Начала учить испанский — и вдруг захотелось вспомнить французский и польский.

У Ольги не просто способности к языкам. В нескольких научно-технических и биографических книгах (в их числе «Экзотические вирусные инфекции», «История автомобилестроения») Ольга Ровная значится переводчиком с польского.

— Я все-таки поэт-песенник и полиглот, точнее, человек, пытающийся учить языки. Мировые хиты на разных языках. Сравниваю варианты одного и того же текста на разных языках. Испанская, французская, немецкая и польская версии песни Жака Бреля «Ne me quitte pas», к примеру. Перевожу тексты и разучиваю песни. Кусками. Хочу написать свои версии некоторых мировых хитов.

— Слово всегда было с тобой… Какое место оно теперь занимает в жизни? Ты говоришь: верховая езда, танцы, астрология, массаж…

— Я работаю как астропсихолог с большим количеством совершенно разных людей и много говорю… Правда, к сложным консультациям готовлюсь письменно, набрасываю примерный план. Параллельно веду блог в интернете и рассказываю там истории из своей практики. Многие друзья спрашивают: «Где же книга?» А я чувствую, что, встречаясь с таким большим количеством людей, с такими разнообразными судьбами коплю материал для будущей книги. Но я не ухожу от стихов. У меня, так сказать, «прикладные» стихи. Я пишу стихи и тексты для людей, которых консультирую. Написала несколько текстов для песен, и скоро они должны зазвучать.

Песни на слова Ольги Ровной исполняют Вика Дайнеко («Иголка», «Фильм не о любви»), группы «Фабрика» («Зажигают огоньки»), «Иванушки International» («Ирония судьбы» и др.). Как поэт-песенник Ольга является членом Российского и Белорусского авторских обществ.

Она писала сценарии рекламного и песенного видео, рекламные слоганы, джинглы; занималась организацией видео- и фотосъемок в рекламном агентстве. Но до столь «элитной» работы была и учителем в школе, няней, вожатой, продавцом… Ее личная история вряд ли спокойнее тех, с которыми нынче к ней идут люди.

— От людей, особенно с тяжелыми историями, устаешь… Как ты восстанавливаешься потом?

— Гантели, штанга. С начала осени начала ходить в тренажерный зал… Я почувствовала необходимость стать сильнее физически. И танцы. Они сильно отвлекают. Лошади. Дорога и лошадь



непредсказуемы, требуют сосредоточенности — и ты не думаешь о работе, о людях с их порой тяжелыми историями. Сон! Он тоже помогает.

— Твой нынешний выбор профессии окончателен?

— Нужно идти дальше. Работы — непочатый край. Мне бы хотелось написать мюзикл. Что-то цельное с единым сюжетом. Стихи — это эмоции и мысли. Мюзикл — развитие сюжета, изменение людей и судеб. Тема перемен. Возможно, это будет аудиоспектакль с различными героями. Было бы интересно написать музыку для мультфильма, а для фильма — просто мечта... Я тоскую по временам, когда специально писали песни для художественных фильмов, а не брали готовые.

— Ты видишь себя в белорусских проектах?

— Всегда рада сотрудничеству с белорусскими исполнителями, участию в совершенно разных проектах. Правда, пишу в основном на русском, хотя есть новый опыт. Написала песню для малой родины, для Залесья... Моя мама поет в местном коллективе «Залесянка» и давно просила написать им песню. И я написала текст на белорусском языке... Это мой первый текст на родном языке. Надеюсь, будут еще пробы. Мне понравилось. Тепло на душе.

— А твое мировосприятие в Беларуси и России отличается?

— Как-то в Москве была на собрании кубинской диаспоры, судьба занесла. И ощутила родство душ... Откуда это? Может, это общность людей, которые родились в маленькой стране? И в нас это есть. Но в России мир развернут ко мне. Он доброжелателен. Он что-то предлагает, что-то просит... Есть ощущение перспектив. Здесь, в Беларуси, такого не было. Я занималась тем же, но меньше была востребована миром. И я ощущаю эту невостребованность, уже сходя на перрон в Беларуси. Хотя все субъективно. Допускаю, что у других белорусов все по-другому. Это мое личное ощущение страны.



Вот в Черногории понимаешь, почему боги жили там! Адриатика. Климат. Тепло и солнце... Там все проще и легче. Правда, там очень много курят. (*Смеется.*) Мы другие... Слишком ответственные. Гиперответственные и напряженные. Они смягчают проблему, а мы ее раздуваем, накручиваем. Она есть, но... Мы буквально ловим кайф от раздувания проблем. Там же живут по принципу «Don't worry, be happy». И любят детей. Там не осекают ребенка и не ставят в наши отечественные жесткие рамки «сюда не лезь, туда не иди» или «того нельзя, этого нельзя». Русские мамы-туристки постоянно «строят» детей на этом доброжелательном фоне «Don't worry, be happy».

Мы все время ждем удара в спину. От этого здорово устаешь.


— Дома скоро будешь?

— За окном холод, и теперь я хочу в теплые края. Хочется улыбок и тепла Латинской Америки. Хочется видеть вокруг людей, в которых много жизни, в которых она бурлит. Люди-лампочки. Сияют! Но в Антарктиду тоже интересно было бы попасть.



Уладзімір Някляеў:
«Проза — занятак цяжкі, але цікавы»

Ужо становіцца звыклым, што паэт Уладзімір Някляеў апошнім часам піша пераважна прозу. Калі не браць у разлік невялічкія апавяданні пачатку 1970-х, дык някляеўская проза пачалася з другой паловы 1980-х гадоў з фантасмагарычна-дакументальнай прыпавесці «Вежа». Аднак калегі-літаратары, палічыўшы «Вежу» ўсяго толькі «выбрыкамі» паэта, асаблівай увагі першаму яго вялікаму празаічнаму досведу не надалі, што, зрэшты, Някляева не спыніла. Асабліва плённым стаў у гэтым сэнсе «эміграцыйны» перыяд, калі былі напісаныя многія апавяданні, аповесці і нават раман пад назвай «Лабух»…



Сергей ШАПРАН

І вось пад самы фінал 2012 года выдаўцом А. А. Калошам надрукаваны новы твор Някляева «Аўтамат з газіроўкай з сіропам і без», вызначаны ім самім як «менскі раман». Падзагаловак невыпадковы, бо Менск у творы — такая ж дзейная асоба, як і тыя персанажы, якія ў гэтым горадзе жылі ці яшчэ жывуць. Прычым падзеі адбываюцца ў двух храналагічных вымярэннях — у пачатку 1960-х і ў нядаўнім часе, дакладней — у 2010–2011 гады, што філасофскі аўтарам абгрунтавана: пазаўчарашнія падзеі могуць знайсці нечаканы працяг у дні заўтрашнім. І хоць думка, вядома, не новая, затое яе ўвасабленне ў рамане — арыгінальнае і часам зусім неспадзяванае. Невыпадкова твор ужо намінаваны на літаратурную прэмію імя Ежы Гедройца.

Пра новы раман, пра Менск і лёс паэта і адначасна празаіка — наша гутарка з Уладзімірам НЯКЛЯЕВЫМ.

— Уладзімір Пракопавіч, віншую Вас з выхадам рамана, але найперш з тым, што Вы ўсё ж нарэшце завяршылі гэтую працу. Бо Ваш раман (а паўгода таму Вы жанрава вызначалі твор як аповесць) мог чакаць лёс многіх Вашых празаічных твораў, якія некалі ўжо былі распачатыя дый так і не завершаныя. Вось і «Аўтамат з газіроўкай з сіропам і без» пісаўся са значнымі перапынкамі на працягу трох гадоў: у маі — жніўні 2008-га, у верасні 2009-га, завершаны быў у сакавіку — чэрвені 2011-га (прычым ствараўся то на Вашай радзіме — у Крэве і Смаргоні, то ў Менску). У звязку з гэтым і пытанне. Не толькі «Аўтамат з газіроўкай...», але і шмат якія празаічныя творы пісаліся Вамі не адразу, не на адным дыханні. Але чым гэта звычайна тлумачыцца?

— Проза — рэч цяжкая, яна патрабуе апроч натхнення і фантазіі проста фізічнай працы: паспрабуй выседзець 10–12 гадзін (мая сярэдняя, калі пішу прозу, норма) за пісьмовым сталом. Таму адна з прычын, па якіх твор не дапісваецца, менавіта ў тым, што стамляешся і думаеш: «А гары яно гарам!»

Стамляешся найхутчэй тады, калі пішацца не так, як ты хацеў бы напісаць. Калі ж усё ідзе як па

пісаным, дык і не адчуваеш стомы. Тады проза як бы сама ўзнікае, проста здараецца, як здараецца паэзія. Нібы без ніякага твайго ўдзелу — як дыктант, які толькі паспявай запісваць!.. Тады гэта не праца, а свята. Але такое бывае не часта. У літаратурнай працы, як і ў жыцці, больш будзённага.

«Я не ўмею пісаць чарнавікі»

— Пачынаецца ўсё і заўсёды нібы са свята. Праз першыя прыдуманыя табой фразы, знойдзеныя вобразы, падабраныя дэталі ўсё, што ты пачынаеш, уяўляецца табе значным. Ты дадаеш слова да слова, сказ да сказа — і раптам аказваецца: фразы, вобразы, дэталі рассыпаныя, як кубікі на стале, і ты, як дзіця, не ўяўляеш карціны, якую можна з іх скласці. Тады скідваеш кубікі са стала. Можна было б, канешне, паспрабаваць скласці іх наўздагад, але...

— Прасцей новае пачаць?

— Так, прасцей новае пачаць. Звычайна дапісваецца тое, што прадумана да эпізодаў у самым фінале. Не абавязкова падзеі і персанажы будуць такімі, якімі ты бачыў іх напачатку, але гэта ўжо іншая справа: твор і персанажы пачынаюць карэктаваць аўтара, нібы ствараць самі сябе. Вельмі, між іншым, цікавы працэс, самімі пісьменнікамі амаль не апісаны, бо яго надзвычай складана апісаць. І ўсё ж у найпростых выявах можна. Да прыкладу, галоўны герой менскага рамана ўжо ў задуме твора праходзіў праз турму. Мне трэба было правесці яго праз гэтае выпрабаванне. Але як? За што, папросту кажучы, яго «пасадзіць»?..

— А тут само жыццё падказала.

— Так. Галоўнага героя менскага рамана яшчэ напачатку 1960-х гадоў павінны былі пасадзіць, па сутнасці, за тое, што ён не такі, як іншыя. Стыляга. Сёння гэта як апазіцыянер. «Пятая калона» ды ўсялякае такое. Праз тое ў 2010-м садзяць мяне самога — і яно стае прычынай зняволення майго галоўнага героя. Прычына ў корані тая самая, але яна ўзбуйнілася — і ўзбуйніла маштаб падзей, характараў.

— Тым не менш падобна на тое, што напісанне рамана, пачатага ў 2008-м і скончанага ў 2011-м, перапынялася не толькі праз тое, што аўтар апынуўся ў турме?

— Так, не толькі праз тое. Творчасць патрабуе ўсяго цябе, ці ва ўсякім разе — усяго твайго часу. Вельмі шмат яго ў апошнія гады забірае ў мяне палітыка. Забірае, адрываючы ад пісьмовага стала. І тут што здараецца? Здараецца не толькі пярэрва ў часе, а пярэрва ў рытме, у знойдзенай, надыханнай інтанацыі, да якой пасля пярэрвы вельмі цяжка вярнуцца. Ну гэта — як ты, скажам, крочыў павольным крокам, пасля пабег, скочыў, спыніўся — паспрабуй вярніся потым да рытмічнага дыхання, знайдзі яго...

Не ведаю, як для каго, а для мяне вельмі важна адчуваць і захоўваць рытміку, інтанацыю, тады мне лёгка пішацца: сказ чапляецца за сказ, яшчэ не паспееш скончыць папярэдні — ужо гатовы наступны. Тэкст ствараецца, як музыка. Мусібыць, гэта праз паэтычную практыку. Калі музыкі ўва мне нямашака, цяжка пісаць.

І яшчэ адна праблема: я не ўмею пісаць чарнавікі. Ну амаль не ўмею. Не магу напісаць чысты наступны сказ, калі папярэдні быццам бы чарнавы. Я павінен давесці яго. Бывае, што над адным сказам, дадаючы і выкрэсліваючы словы, перастаўляючы паўзы, паўдня працую. Не магу пакінуць недапрацаваны сказ на потым і пісаць далей. Ён ува мяне сядзіць, як стрэмка. Таму я марудна прозу пішу, вельмі марудна. «Аўтамат з газіроўкай...» — гэта невялікі раман, для нейкага спрактыкаванага празаіка кшталту Івана Шамякіна — на пару месяцаў працы...

— Калі лічыць храналагічна, дык у Вас тры гады атрымалася.

— Так, хоць і пярэрвы вялікія былі... Гэтаксама доўга пісаў я ўсю прозу: і раман «Лабух», і «Вяртанне Веры», і «Прагу», і «Мірон ды Мірон». Нават «Вежа», маленькая аповесць (нейкія сорак старонак займае ў кнізе) пісалася ў тры прыёмы: у 1986, 1987 і 1988 гадах. А паэму «Ложак для пчалы», якую трэба было б пісаць два гады, напісаў за два месяцы. Праўда, я пісаў яе і наяве, і ў сне, што, канешне, працэс стварэння значна скараціла. Але так (напалову несвядома, нібы не табою) пішацца толькі паэзія, прозу так не напішаш.

— Вось я і хацеў спытаць, як увогуле адбываецца праца над празаічным творам. Ці робіце папярэдне нейкія накіды, сюжэтныя распрацоўкі? Увогуле, ці ўяўляеце, чым нарэшце завершыце твор?

— Ты напісаў кнігу пра Васіля Быкава — і добра ведаеш ягоную творчую кухню. Спачатку ён дэталёва распрацоўваў схему, якую пасля насычаў тэкстам. Ну гэта правільна, так робяцца не толькі літаратурныя творы, але і тэлевізары. Але калі ў тэлевізары схемы не відаць, бо ён не яе, а кіно паказвае, дык у літаратурным творы схаваць схему цяжка. Яна праглядваецца нават у такой выбітнай аповесці Быкава, як «Сотнікаў», а праз тое, між іншым, і ў фільме паводле гэтай аповесці. Я не сцвярджаю, што такая тэхналогія стварэння рамана ці аповесці кепская, я кажу, што я ёй не карыстаюся. Прыкідваю збольшага сюжэт, акрэсліваю ягонае развіццё, але дэталёвымі распрацоўкамі сюжэта і характараў не займаюся. У гэтым ёсць свае недахопы, але ёсць і перавагі: героі нібы самастойна жывуць сваім жыццём. Я не змушаю іх рабіць абавязкова тое,

што ў самым пачатку за іх прыдумаў, часцяком яны дзейнічаюць насуперак волі аўтара. Ты перакананы, што іх ведаеш, што яны мусяць казаць так і рабіць гэтак, а нехта з іх паўстае: «Не! Я зусім не такі, якім ты мяне ведаў. У мяне іншы, якога ты раней не бачыў, не заўважаў, характар». І ён прамаўляе іншыя словы, робіць іншыя ўчынкі. У выніку гэта змяняе (як у вы-



падку з «Аўтаматам з газіроўкай...») не толькі эпізоды, але і сюжэтную лінію: героі самі тorгаюць нітачкі сюжэта. І гэта ўжо мне самому цікава. Гэта адна з прычын, па якой я і пішу прозу. *(Смяецца.)* Даволі часта мяне здзіўляе тое, што адбываецца ў працэсе напісання твора, здзіўляюць паводзіны маіх герояў. Вось я меркаваў ускладніць унутраную драму галоўнага героя менскага рамана фізічнай блізкасцю з галоўнай гераіняй, хлапчука з маладой жанчынай, а ён запрацівіўся: «Гэтага хочаш ты, а не я...» І не ўдалося мне з ім дамовіцца, давялося напісанае выкінуць.

Проза — занятак цяжкі, але цікавы. Ва ўсялякім выпадку — не сумны.

У паэзіі ў мяне ёсць рэчы, у стварэнні якіх, як мне здаецца, я не браў ніякага ўдзелу — яны нібы самі напісаліся. Напрыклад, паэма «Паланэз». І калі нехта мне казаў: «Во-о-сь, не тое ты ў паэме зрабіў, не трэба было ўводзіць у сюжэт гістарычную лінію, вялікіх літоўскіх князёў прыплятаць — і быў бы класічны аповед у вершах пра высокае каханне...» — дык нічога я там не рабіў і нікога не прыплятаў! Вялікія князі самі з'явіліся, самі сказалі ўсё, што хацелі *(усміхаецца)*, павярнуліся і — пайшлі.

— Вы, відаць, шмат з чаго самі здзівіліся, калі перачыталі ўжо напісаную паэму?

— Так, шмат з чаго сам здзівіўся. Як яно ўсё сталася?.. І, мяркую, гэтае здзіўленне — адна з прычын, па якіх людзі пішуць. Ва ўсякім разе, я.

— «Аўтамат з газіроўкай з сіропам і без» жанрава вызначаўся Вамі спачатку як аповесць. Падобна, што гэтая аповесць стала раманам ужо тады, калі ў творы з'явіўся другі план — маю на ўвазе прэзідэнцкую кампанію 2010 года, у выніку якой Вы і апынуліся за кратамі ў сумна вядомай «амерыканцы», унутранай турме КДБ. Іншымі словамі, падзеі снежня 2010 — чэрвеня 2011 года сталі ў рамане своеасаблівым дахам над домам, які Вы ніяк не маглі дабудаваць. Без гэтага, магчыма, Вы б яго і не дабудавалі?

— Не, я ў любым выпадку не кінуў бы гэтую прозу. Яна ад пачатку задалася, адразу лёгка-лёгка пайшла. Я не люблю пісьма цяжкога — ні свайго, ні чужога. Не магу чытаць творы, у якіх груваздкасць, каструбаватасць такая, што прадзіраешся праз кожны сказ. Мастацкая проза — гэта прыгожае пісьменства. Яна павінна выглядаць лёгка, ажурна, каб усё ляцела і пырскала фарбамі, каб чытач не знясільваўся, спрабуючы пранікнуць у сэнс таго, што ты напісаў. Гэта павінен быць палёт ластаўкі над вадой. Так, метафары могуць быць самыя складаныя, але разам з тым — лёгкія. Падтэксты, якія там ёсьціка, павінны быць роўна настолькі загадкавымі, каб чытач іх разгадваў і радаваўся, што разгадаў. «А, вось я ўцяміў, што ты гэтым хацеў сказаць!» Мастацтва — гэта ўсё ж гульня, хай нават яна геніяльная. І гэта гульня не ў «так было ці так не было», не ў праўду ці ў няпраўду. Якая праўда ў «Мёртвых душах» Гогаля — узоры геніяльнай гульні? Ніякай там праўды няма — і разам з тым там праўда ўся, якая ёсць. Чаму? Бо чытаецца — як ластаўка над вадой ляціць.

Вось гэтага мне і хацелася дасягнуць у менскім рамане, які пачынаўся не так, як пачынаецца, праездам першага тралейбуса па праспекце, а размовай, якую галоўны герой...

— Гэта значыцца Вы...

— Ну няхай сабе так. Флабер казаў: «Мадам Бавары — гэта я». А ў менскім рамане насамрэч шмат аўтабіяграфічнага, і пачынаўся ён размовай галоўнага героя і аўтамата з газіроўкай (які таксама адзін з герояў рамана) пра тое, што ў кожным часе свой пах, свае мелодыі, фарбы — і сонца ў кожным часе сваё. Сонца 1960-х гадоў — гэта не сонца 2010-х. Не ведаю, як тут патлумачыць... Вядома, фізічна сонца — тое самае: тая ж ядзерная рэакцыя ў ім адбываецца, з той жа хуткасцю ягонае святло дасягае зямлі. І ўсё ж яно іншае... Не скажу, што горшае за тое, якое было, але тое — асаблівае. Як асаблівыя тыя гукі, пахі, колеры, той пчаліны гуд у ліпах, звоны тых трамваяў, галасы тых людзей... І калі я нырнуў у аўру тых гадоў, мне захацелася даплыць ад берага да берага. Таму яшчэ раз кажу: я б не кінуў гэты раман, дапісаў бы яго ў любым выпадку, змяніўшы ці не змяніўшы сюжэт.

«Гісторыя — не тое, што было, а тое, што пра яе напісана»

— Між тым, памятаю, калі Вы мінулай вясной давалі мне пачытаць «Аўтамат з газіроўкай...», дык, рыхтуючы ўрывак з яго да друку, мы дамовіліся пазначыць яго як фрагмент з незавершанай аповесці — такім чынам Вы нібыта крыж паставілі тады на творы.

— Ну, мусібыць, у мяне быў такі стан пасля турмы — проста фізічна было не да таго... Мне тады дасталася вельмі моцна, я так кепска сябе ніколі ў жыцці не пачуваў...

— Кепска фізічна ці ўсё ж маральна?

— Фізічна. Бо чаму я маральна павінен быў пачуваць сябе кепска? Я нічога такога, за што мне было б сорамна, не зрабіў.

— А калі прыніжаюць...

— Хто прыніжае?

— У засценках КДБ хіба не так было?

— Ну і што? Хто яны такія?! Хто мяне там мог прынізіць?! Перад кім я там мог адчуваць сябе маральна прыніжаным, вінаватым? Калі б там былі людзі, якіх бы я паважаў... Ну, калі б, скажам, следчым быў Быкаў *(усміхаецца)*, а аператыўнікамі *(смяецца)* — Барадулін з Бураўкіным, і яны б мяне дапытвалі, дзяўблі: «Ты — сякі-такі, вораг народа!» — тады было б цяжкавата.

— А тыя ж катаванні? Ці нельга назваць тое, што рабілі з Вамі ў КДБ, катаваннямі?

— Гэта былі менавіта катаванні, якія ледзь не прывялі да... Зрэшты, не хачу пра гэта. Штокольвечы напісанае ў рамане, пра астатняе — прыйдзе час...

— Тады давайце вернемся да «Аўтамата з газіроўкай...». Гэта другі раман паэта Уладзіміра Някляева. Першы — «Лабух» — неяк асобна стаіць, на мой погляд, не толькі ў Вашай творчасці, а ва ўсёй беларускай літаратуры. «Аўтамат з газіроўкай...» вызначаецца адметнай лёгкасцю стылю...

— Ну і ў «Лабуху» не цяжкі *(усміхаецца)* стыль...

— І гэта не толькі маё меркаванне, але і сцверджанне такіх знаўцаў літаратуры, як Лявон Баршчэўскі, Леанід Галубовіч...

— І я з імі згодны, калі мяне можна прылічыць да літаратурных знаўцаў. У «Аўтамаце з газіроўкай...», безумоўна, іншая, чым у «Лабуху», стылістыка, але ніяк не цяжкая. Дарэчы, Андрэй Клімаў, які, як вядома, не літаратуразнаўца, а палітык, прачытаў «Лабуха» якраз праз тое, што, як ён сказаў, раман цікава і лёгка чытаецца. Гэта была першая кніга, якую ён, рускамоўны чалавек, адолеў па-беларуску. Дык «Аўтамат з газіроўкай...» здаўся яму яшчэ цікавейшым і стылёва лягчэйшым. І цяпер палітык Клімаў *(усміхаецца)* — чытач ужо дзвюх беларускамоўных кніг.



Уладзімір Някляеў, кандыдат у прэзідэнты, пасля збіцця ў дзень выбараў

— Мяркую, што стылёвая лёгкасць «Аўтамата з газіроўкай...» тлумачыцца не толькі тэмай (Вы апавядаеце пра гады сваёй маладосці, адсюль і лёгкасць аповеду, нягледзячы на тое што шмат на якіх старонках апісваюцца падзеі драматычныя), але і тым, што самі падзеі — і тыя, што рэальна адбываліся, і тыя, што былі прыдуманыя, — знаходзяцца на вялікай адлегласці, тады як сюжэтная канва ў «Лабуху» непасрэдна звязаная з сённяшнім часам. І хоць у «Аўтамаце з газіроўкай...» таксама прысутнічае наш час, але ён не дамінуе, ён з'яўляецца толькі лагічным працягам і завяршэннем падзей, якія мелі месца ў 1960-я гады. У звязку з гэтым (калі мець на ўвазе «Лабуха»), можа, яшчэ зарана пісаць пра цяперашні час?

— «Лабух» таксама пісаўся праз нейкую адлегласць...

— Але ўсё ж не вялікую.

— Так, не вялікую. Увогуле, паміж рэальнай падзеяй і апісаннем яе (каб яе найлепшым чынам выпісаць) павінен быць люфт, і чым гэты люфт большы, тым лепш. І чым падзея большая, тым адлегласць, з якой ты на яе глядзіш, пажадана мець большую. Але ж адлегласць гэтая, калі ты хочаш напісаць пра нешта сённяшняе, а не пра вайну 1812 года, не можа быць большай за жыццё. Вось і бярэшся пісаць, пакуль жывы...

Чым большая падзея, тым больш у яе трактовак. Скажам, тая ж Плошча 2010 года, пра якую напісана ў «Аўтамаце з газіроўкай...». Для некага гэта адна Плошча, для кагосьці — іншая. Апытай 700 чалавек, якія былі арыштаваныя, спытай любога з паўсотні тысяч, хто на той Плошчы быў, і кожны раскажа табе пра сваю Плошчу. Таму ў рамане распавядаецца не столькі пра яе, колькі пра людзей на ёй і канкрэтна пра чалавека, які шукае адказ на пытанне, чаго ён варты. Ці варты ён той жа Плошчы, а праз яе — тых юначых ідэалаў, якія яго на Плошчу прывялі? У ягоным жыцці было тое, што ён палічыў здрадай, хай несвядомай і дробязнай, але ўсё ж здрадай, прычым, здрадай каханню, і ён нібы прамервае сябе сённяшняга сабой тагачасным, мужчыну — хлопчыкам і наадварот. Якім ён быў, якім стаў, у які бок зрушыўся?.. Ці лепшы ён за тых, каго лічыць горшымі? Мы ж звычайна ідэалізуем сябе, мы заўсёды лепшыя за іншых, праз што я, дарэчы, не люблю ні чытаць, ні пісаць мемуары...

— У якіх мы міфалагізуемся...

— Так, у якіх міфалагізуемся. Я вось апошнім часам нешта запісваю мемуарнае — і як ні стараюся, каб там меней было пра сябе найлепшага, не кожнага разу ўдаецца... І калі мяне 15-гадовага, які таксама запісваў нешта ў дзённік, розніца паміж мной ды іншымі не моцна здзіўляла (бо, канешне ж, астатнія не такія, не могуць быць такімі, як я), дык 65-гадовага — здзіўляе даволі моцна. І гэта больш важна, для літаратуры больш важна, чым тое, што спецназ «Алмаз» малаціў цябе палкамі — і ўсё па галаве. А ў ёй, у галаве, што? Пытанне, ці варты ты міфаў пра самога сябе, калі патрапляеш у тыя абставіны, у якія патрапіў герой рамана. Што ты сёння ёсць са сваімі ўжо набранымі гадамі, звычкамі, воляй, характарам?..

Маладосць, зразумела, — найлепшае, што ёсць, але ці ўсё ў ёй было найлепшым? Як мы выхоўваліся ў той час? На чым, на кім? Калі спрасціць — на «Маладой гвардыі». На героях, гатовых да самаахвярнасці. Гатоўнасць ахвяраваць сабой дзеля нейкай высокай ідэі лічылася ўзорам таго, што чалавек здольны зрабіць. Пра саму ідэю менш задумваліся, чым пра тое, як даказаць, што ты яе варты. А як даказаць? Аказвалася, варты вялікай ідэі ты толькі тады, калі за яе загінеш, кінешся на кулямёт...

— Калі яшчэ пашчасціць кінуцца на той кулямёт...

— Так, ці калі паслізнешся. *(Усміхаецца.)* Гэтак разбуральнікі савецкіх міфаў ужо ў паслясавецкі час пра Аляксандра Матросава пісалі, які, ахвяруючы сабой, кінуўся на кулямёт. Маўляў, не кінуўся, а паслізнуўся...

Я б такога ніколі не напісаў, я — міфафіл, але ўвогуле, калі скарыстаць знакаміты афарызм пра камяні: ёсць час збіраць міфы — і ёсць час іх раскідваць. Вось мы размаўляем з табой у юбілейны год паўстання 1863 года. Чым яно ёсць для большасці нашых сучаснікаў? Міфам пра Кастуся Каліноўскага. Чаму гэты міф, які ўзнік у часе нашага першага нацыянальнага Адраджэння, падтрымліваўся ў савецкія гады? Таму што адпавядаў савецкім ідэалагемам. Каліноўскі — герой, які ахвяраваў сабой, пайшоў на шыбеніцу дзеля народнага шчасця. А чаму цяпер сталі казаць, што народ таго шчасця не надта хацеў? Бо з'явіўся новы герой — і ўсе папярэднія яму замінаюць...

Ну ды Бог з ім.

З Каліноўскім, са знакавай постаццю нашай гісторыі, адбыўся яшчэ гэтакі рэдкі выпадак: ніхто з нашых суседзяў не спрабуе ў нас яго забраць. Ні палякі, ні літоўцы, ні ўкраінцы, ні тым больш рускія. І гэта нас так здзівіла, што мы самі пачалі ад яго адпіхвацца: хто-небудзь забярыце! І шмат у чым сённяшніх беларусаў — народ без гістарычнай, не напоўненай міфамі памяці, — гэта характарызуе.

Што ж мы маем, як мой бацька пытаўся, у бухгалтэрыі? Маем процьму людзей, якія загінулі, ахвяравалі сабой дзеля ідэі. Яшчэ болей тых, хто быў знішчаны ў імя яе. І што? Дзе тая ідэя?..

У ката пад хвастом. Выходзіць, і чалавечыя лёсы там?.. Сотні, тысячы, мільёны...



Ніхто ў мяне пра тое, зразумела, не пытае, але як я, паэт, літаратар, магу такое дапусціць?..

Ніяк.

Гісторыя — не тое, што было, а тое, што пра яе напісана. У кожны гістарычны момант розныя падзеі і постаці ўспрымаюцца па-рознаму. Але для мяне як для літаратара гэта зусім не азначае, што ўзнёслыя, рамантычныя, самаахвярныя постаці павінны гэтых якасцяў, гэтай сваёй знакавасці пазбаўляцца...

— Таму Вы — міфатворца?

— Не адзін я. Вунь Аркадзь Куляшоў напісаў паэму «Хамуціус». А Уладзімір Караткевіч — гэта суцэльны міф пра Беларусь, які стаўся падмуркам нашага другога Адраджэння. І нават суровы рэаліст Васіль Быкаў — міфатворца. Што ёсць ягоная аповесць «Сотнікаў», як не міф пра чалавека, гатовага ахвяраваць сабой?..

Сотнікаў, герой быкаўскай аповесці, з'явіўся не таму, што ён савецкай ідэалогіі быў патрэбны. Дакладней, не толькі таму. Ён патрэбны быў самому Быкаву. Сотнікаў — і ёсць сам Быкаў, толькі лепшы за яго. Ім самім міфалагізаваны.

Нам патрэбныя лепшыя ў мінулым дзеля лепшых у будучыні. І калі я кажу пра міфалогію, дык якраз гэта маю на ўвазе. Трэба скарыстоўваць усё, што можна скарыстаць дзеля стварэння гістарычнай перспектывы, якая пустая без магутных постацяў. І малайцы тыя, хто стараўся і стараецца гэта зрабіць, ствараючы міфы пра розныя часы і пра розных людзей. Менавіта такую спробу зрабіў я ў рамане «Аўтамат з газіроўкай...» — кнізе ўдзячнасці Менску і ўсім тым, хто разам з Менскам увайшоў у маё жыццё. У тым ліку — Кіму Хадзееву, аднаму з герояў рамана і рэальнаму чалавеку, які таксама, між іншым, быў міфатворцам.

— Пра Хадзеева — ці не адзінага беларускага дысідэнта, які аказаў вялікі ўплыў не толькі на Вас, невыпадкова пра яго і дасюль ходзяць легенды, — хацеў бы пагаварыць пазней, а пакуль што ў звязку з тым, пра што Вы толькі што сказалі, мне прыгадалася Ваша думка з «Лабуха»: «Магчыма, каб у нас, у беларусаў, былі Бетховен ці Малер, дык былі б і мы, беларусы. Хоць, хутчэй за ўсё, Бетховена з Малерам у нас бы забралі. Ці палякі, ці літоўцы, ці рускія...»

— Гэта ў «Лабуху» я так напісаў?.. Правільна напісаў. *(Усміхаецца.)* А калі б Моцарт быў...

— Аднак ці правільна зразумеў: Вы супраць або сумняваецеся ў тым, што самаахвярнасць увогуле патрэбная, бо можа прывесці да нечаканага выніку?

— Да нечаканага выніку можа прывесці нават тое, што чакаецца. Самаахвярнасць далёка не заўсёды сябе апраўдвае, але без яе ўсё выглядала б зусім сумна. Самаахвярныя людзі патрэбныя не адно для таго, каб ствараць пра іх міфы, — яны патрэбныя, каб усе астатнія ў гэтым свеце хоць неяк адчувалі, разумелі, што насамрэч ёсць жыццё... *(У Някляева зазваніў мабільны тэлефон.)* Гэта патэлефанаваў Валер Каліноўскі, ён пра Алеся Бяляцкага кнігу напісаў, запрашае на прэзентацыю. І вось табе ў працяг нашай размовы невялічкая гісторыя з Бяляцкім... Ён сядзіць у турме, я прысвяціў яму верш, а мне кажуць: «Такім вершам, як ордэнам, толькі сапраўднага героя можна было б узнагародзіць, бо гэта на ўсе вякі. А хто ён такі?! Касір...» Слухайце, беларусы... Я з вас шалею. Калі ёсць магчымасць узвысіць чалавека, што ж яго прыніжаць? Тым больш, калі чалавек гэты, канкрэтна Алесь Бяляцкі, якога я ведаю яшчэ з ягоных юначых гадоў, — светлы і ўзнёслы, калі за ім ужо не проста біяграфія, а лёс. Дык не: спадары беларусы гатовыя бамбаваць адзін аднаго, як тэрарысты нейкія! Нездарма адзін з персанажаў менскага рамана кажа пра Менск як пра сталіцу тэрарыстаў. Яны таксама, дарэчы, не сказаць, што не самаахвярныя. Але з якім знакам тая самаахвярнасць?..

— Калі пра самаахвярнасць яшчэ казаць, дык можна прыгадаць лідара «Маладога фронту» Змітра Дашкевіча, бо гэта, на мой погляд, практычна бездакорны прыклад высокай самаахвярнасці.

— Так, згодны. Але зноў жа: зараз пішу драму пра 1863 год, дзе Каліноўскі — аднначасова Дашкевіч, і Дашкевіч — аднначасова Каліноўскі. Прачытаў пару старонак сябру, паэту, ён скрывіўся: «Штучны сюжэтны ход, непараўнальныя велічыні! Я б на тваім месцы пачакаў...» Чаго? Пакуль Дашкевіча, як Каліноўскага, павесяць? Тады непараўнальныя велічыні падраўняюцца? Дык, можа, Дашкевіча і павесілі б, ды, дзякуй Богу, не тыя часы. А ў тыя б — павесілі. І мяне, дарэчы, павесілі б. Калі не ў Вільні на пляцы, дык у Менску на Плошчы.

— У Вас у турме напісаўся верш:

...Ты, Воля беларуская, Ты, мара
Крывіцкая, Ты, крэўная мая!..
Калі Табе патрэбная ахвяра...

— «Ёй стану я». Верш для мяне не характэрны, зашмат узнёсласці, але, дальбог, тут няма ніякай позы. Менавіта гэтак самаахвярна (і зусім натуральна) у той момант, у той дзень, а дакладней, у ноч з 31 снежня на 1 студзеня, з 2010 года ў 2011 год я сябе адчуваў.

«Я і цяпер выбраў бы літаратуру, калі б не меў тых абавязкаў, якія займеў, заняўшыся палітыкай»

Гэта было абсалютна шчыра, прычым псіхалагічна так лёгка ўсё яно адчувалася, нават хацелася гэтага... Магчыма, праз тое, што фізічна вельмі цяжка было. Фізічна я гэтак адчуваў сябе, што, здавалася, не вытрымаю, проста не вытрымаю.





Студэнт Літаратурнага інстытута імя Горкага (1972 год, Масква)

Але — на ўласнае здзіўленне — трываў. Бо рыхтаваўся да гэтага, і, аказваецца, чалавек, калі падрыхтуецца, здольны на большае, чым сам ад сябе чакае. А яны не былі падрыхтаваныя, яны думалі, што я, што ўсе мы адразу зламаемся, распаўзёмся ў іх пад нагамі. Ды выйшла не так: і што яны ні выраблялі, я ўсё адно адчуваў перавагу над імі. І відно было, што яны гэта таксама адчуваюць — ім цяжка было гэта схаваць. Стан мой быў прыблізна такі: «Усё, што з табой будзе, павінна быць — і ты гатовы да ўсяго». У такім стане і напісаўся верш. Нават не напісаўся — прысніўся... Так, менавіта прысніўся. Мне там два вершы прысніліся: на адзін я забыўся, а гэты запісаў.

— Мне вось што прыгадваецца... Калі Вы апынуліся, па сутнасці, у эміграцыі, дык пісалі ў адным з лістоў да сяброў, што з'ехалі ў тым ліку і таму, што турмы Вы ўжо не вытрымаеце. Але прайшло дзесяць гадоў, і як павярнуўся Ваш лёс! Зрэшты на гэты раз да турмы Вы ўжо былі гатовы. У чарговы раз пераконваешся ў тым, што ўсё ж чалавек не ведае сам сябе.

— Важна не толькі тое, ведае сябе чалавек ці не ведае, гатовы да нечага ці не гатовы. Не менш важна, дзеля чаго гатовы. Як бы гэта патлумачыць... Ну вось уяві: будзеш ты ісці па вуліцы, і нейкі чалавек, няхай твой добры знаёмы, так паслізнецца, што паляціць пад трамвай. Нават калі ты зрушышся, каб дапамагчы яму, дык усё адно ў цябе прамільгне думка пра небяспеку: ён жа і цябе можа з сабой пацягнуць. А калі гэта будзе твая каханая? Тваё дзіця? Ты хіба будзеш думаць, што разам з імі трамвай і цябе задушыць можа? Ты кінешся іх ратаваць, пра сябе не думаючы. Сам пакладзешся пад колы, але крэўна дарагога для цябе чалавека з-пад іх выцягнеш... Я, ва ўсякім разе, ведаючы сябе, зрабіў бы менавіта так.

Дык вось: у 1999 годзе праблемы, якія ўзніклі ў мяне з уладай і прывялі да эміграцыі, тычыліся часопіса «Крыніца» і газеты «Літаратура і мастацтва», дзе я быў галоўным рэдактарам, ды Саюза пісьменнікаў, у якім я быў старшынём. Можна сказаць, што і часопіс, і газета, і Саюз пісьменнікаў — добрыя мае знаёмыя, нават блізкія, але ўсё ж не крэўныя людзі. Я бараніў іх як мог, але ўсё ж не праз іх было пад колы кідацца. Тым больш што некаторыя блізкія людзі павялі сябе так, што сталі далей за далёкіх... Таму, калі ўлада ціскам сваім давяла мяне да сур'ёзнай праблемы са здароўем, я спытаў сябе: «А за што? За каго я сканаць павінен?..» — і з'ехаў у замежжа.

Рашэнне «махнуць крылом» я прыняў яшчэ і таму, што асноўным маім праціўнікам быў тады не Лукашэнка, а віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Уладзімір Замяталін, якому ад'ездам за мяжу можна было нібы сказаць: «Ды пайшоў ты! Буду я з табой звязвацца!..» І гэта не выглядала так, нібы я адмовіўся ад барацьбы. Гэта ён, Замяталін, сабраў на мяне і падаў Лукашэнку тэчку з

«кампраматам», падключыўшы для гэтага КДБ ды іншыя спецслужбы. І гэта яму даслаў я з Варшавы «песеньку», надрукаваную ў газеце «Имя», у якой ты ў той час працаваў:

Руки в брюки, кепчонку на брови,
Сигаретка дымит на губе,
До свиданья, полковник Петрович,
Поцелуй за меня КГБ.

У 2010 годзе сітуацыя ўзнікла іншая: я быў не старшынём Саюза пісьменнікаў, а кандыдатам у прэзідэнты. І непасрэдным праціўнікам маім быў Лукашэнка. І размова ішла выключна пра крэўнае: пра Беларусь. Вось тут я гатовы быў кінуцца пад колы. Гатовы быў да таго, пра што ў турме прысніў верш. Гатовы быў прайсці шлях, з якога нельга збочыць і які мог прывесці... ну да таго, да чаго ўсё ж, дзякуй Богу, не прывёў.

— Сёння Вы гатовы да самаахвяравання?

— Я гатовы да таго ж, да чаго быў гатовы і ў 2010 годзе. Па сутнасці, я выбягаю на фінішную прамую, і для мяне вельмі важна прабегчы яе з вынікам. Тое, чым апошнія гады я займаюся, вельмі дорага мне каштуе, бо палітыку я не люблю і не люблю палітыкаў, ну, прынамсі, тых людзей, якія сёння ў палітыцы ёсць. Гэта *(смяецца)* не самыя, мякка кажучы, лепшыя людзі, якія сустрэліся мне ў жыцці, але што ж... Што ёсць — тое ёсць, тут нічога не зробіш. Я таксама для іх, як па ўсім відно, не найлепшы. І праблема не ў гэтым. Праблема ў тым, што ў 2010 годзе я не займеў выніку, на які разлічваў.

— Вы маеце на ўвазе сілавы разгон Плошчы і тое, што было пасля?

— Так, Плошчу і ўсё тое, што з ёй звязанае... Рэпрэсіі ў дачыненні не толькі да палітычных актывістаў — да ўсяго грамадства. Міжнародная ізаляцыя... Нібыта ўсё кепска, нічога добрага... І ўсё ж Плошча-2010 — паваротная кропка ў найноўшай гісторыі Беларусі. Толькі надта доўга мы на гэтай кропцы топчамся.

— Дык, можа, сысці? У Вас жа, у адрозненне ад іншых палітыкаў, заўсёды ёсць выбар, бо ў Вас ёсць літаратура. І ніхто пасля не скажа... Хоць калі пра Бяляцкага кажуць, што ён — касір, дык, можа, і пра Вас нехта скажа, калі сыдзеце з палітыкі, што Вы тым самым некаму ці нечаму здрадзілі...

— У палітыцы важны выключна вынік. Гэта не літаратура, дзе мае значэнне яшчэ і працэс. Таму без выніку хоць сыходзь, хоць заставайся — адна пашана. Нічога добрага не пачуеш... *(Праз паўзу.)* Вось мяне ацэньваюць, я ацэньваю. Ва ўсіх свае крытэрыі ацэнак, розныя падыходы. У мяне такі: ці была ў чалавека, дзеянні якога я ацэньваю, магчымасць выбару. Ну ён не краў, бо не меў такой магчымасці, ці не ўкраў, калі меў магчымасць украсці? Яго спакушалі, была ў яго магчымасць дарвацца да ўлады, грошай, славы, прадаўшы сябра, а ён не спакусіўся і не прадаў... Толькі тады можна сказаць пра таго, хто не ўзяў грошай, што ён не злодзей, а пра таго, хто не здрадзіў, што ён не здраднік... У тым жа 1999 годзе мне заставаўся ўсяго адзін крок у той ці іншы бок. Хоць,



здавалася, ад мяне нічога асабліва не патрабавалі, проста казалі: будзем адзін да аднаго добра ставіцца, я табе дапамагаю, ты мне дапамагаеш, час ад часу заўважыш між іншым: малайчына кіраўнік дзяржавы, мудра ўсё робіць.

— Вам менавіта гэта прапаноўвалі?

— Для пачатку... Дык вось як тады ў мяне быў выбар, гэтак і цяпер ёсць. Прычым той самы: палітыка ці літаратура. З той розніцай, што літаратура — тая самая, а палітыка — іншая. Дык я і цяпер выбраў бы літаратуру, калі б не меў тых абавязкаў, якія займеў, заняўшыся палітыкай. Найперш абавязкаў перад людзьмі. Іх тысячы, і я спрычыніўся да іх лёсаў. Дык як сказаць ім: «Вас трохі палкамі праз мяне пабілі, вы пасядзелі ў турме за мяне, а цяпер бывайце!» Ніяк такое не скажаш. Усе мы — закладнікі раней прынятых рашэнняў. І застаецца хіба зайздросціць людзям, якія ўмеюць жыць так, як жыве Лукашэнка: сёння сказаў адно — забыўся, заўтра — другое, і не да галавы яму… Ён, дарэчы, і раней такі быў. Зрэшты, якім ён мог быць раней? Гэткім самым, бо чалавек унутрана практычна не мяняецца.

— Які займеў стрыжань яшчэ ў дзяцінстве…

— З тым і жывеш.

— А што тычыцца таго, што Вам не падабаюцца людзі, якія ёсць цяпер у палітыцы. Гэта ж у Вашым рамане падчас допыту галоўны герой гаворыць, што ў палітыцы ў яго няма ні сяброў, ні ворагаў. «Нікога. Адзін», — кажа ён. Але ён — гэта, па сутнасці, Вы. А значыцца, кажаце Вы?

— У дадзеным выпадку так.

— У рамане Вы выкарыстоўваеце незвычайны не толькі для беларускай, але і для сусветнай літаратуры прыём: асобныя Вашы персанажы не толькі маюць рэальных прататыпаў, але і носяць прозвішчы гэтых, так бы мовіць, прататыпаў. Гаворка ідзе, у прыватнасці, пра акцёра Рускага тэатра Эдуарда Гарачага, пра пісьменніка Уладзіміра Караткевіча, пра рускага акцёра Андрэя Міронава, пра Тумаса — дырэктара тэхнікума, у якім Вы вучыліся, пра першага сакратара ЦК КПСС Мікіту Хрушчова і Лі Харві Освальда, забойцу прэзідэнта ЗША Джона Кенэдзі. Чым гэта выклікана? Тым больш што стваралі Вы ўсё ж не дакументальны, а мастацкі твор…

— Менавіта таму, што твор мастацкі, і прыдумваеш для героя прозвішча, імя…

— І не заўсёды ўдалае.

— *(Смяецца.)* Ну так. А тут, калі ласка, гатовае. Хоць тое, што ён — Уладзімір Караткевіч, зусім не азначае, што ён — Уладзімір Караткевіч, разумееш? І тое, што ён — Освальд, таксама не азначае, што ён — Освальд. Дык якая розніца? Вось сядзеў бы я і прыдумваў: Міхалевіч, Мілінкевіч ці хто павінен быць Караткевічам?.. Гэта сёння для нас — для мяне, для Барадуліна — Караткевіч — гэта Караткевіч…

— Жывы чалавек.

— Жывы чалавек, а яшчэ трошкі часу пройдзе, і ён будзе…

— Больш літаратурным персанажам…

— Так, а значыць, «жывейшым за ўсіх жывых», як напісаў адзін вядомы паэт пра аднаго вядомага палітыка. Абы-што напісаў, дарэчы…

— Не магу не ўтрымацца, каб не прывесці Ваша апісанне Караткевіча: «Павярнуўшыся, я блізка, твар у твар убачыў дзецюка з русявымі, што хваляй спадалі на лоб, валасамі і з гэткімі ж мякка-насмешлівымі, як і голас, вачамі, якія, пры ўсёй мяккасці позірку, нечакана здзіўлялі, нават насцярожвалі тым, што былі рознакаляровыя: правае вока — шэра-зялёнае, а левае — светла-карычневае, арэхавае, якое глядзела да таго ж паўз цябе, нібы трохі косячы».

Дарэчы, я і не ведаў, што вочы Уладзіміра Сямёнавіча былі рознага колеру. Прачытаўшы пра гэта ў Вашым рамане, запытаўся ў Рыгора Барадуліна, і ён пацвердзіў, але не змог дакладна сказаць, якіх менавіта колераў былі яго вочы.

— Я хоць і сам помню, але яшчэ і ў пляменніцы Караткевіча спытаўся, якога колеру было левае вока, якога — правае. Яна назвала менавіта тыя колеры, якія я запомніў.

— Ці выпадкова ў рамане з'явіўся толькі адзін пісьменнік (ва ўсялякім разе, пісьменнік, у якога ў рамане ёсць імя) — і гэта менавіта Караткевіч? Бо тады, у 1960 годзе, уладарамі думак былі зусім іншыя літаратары, а Караткевіч толькі-толькі ўваходзіў у літаратуру — нават «Каласы пад сярпом тваім» яшчэ не былі напісаныя.

— Не выпадкова. Уладзімір Караткевіч, як я ўжо казаў, — найпершы ў беларускай літаратуры стваральнік міфаў. *(Усміхаецца).* Тым ён мне і дарагі. Я спавядаю многія з тых падыходаў да жыцця, да людзей, да літаратуры, якія спавядаў ён. Скажам, я ніколі не чуў, каб ён некага без дай прычыны прынізіў. Каб пра нешта вартае адазваўся паблажліва. І ў ягоных творах відаць, як ён кожнага прыстойнага чалавека падымае на максімальна магчымую для таго чалавека вышыню. Ён любуецца такімі людзьмі, калі выпісвае іх. Адмоўных жа герояў ён нібы штрыхамі накідвае: ну ёсць такія, дый халера з імі! Як у «Дзікім паляванні караля Стаха» — над балотам нейкая безаблічная хмара на конях ляціць.

Што ж да беларускіх пісьменнікаў, якія ў 1960-я гады, былі, як ты кажаш, «валадарамі думак» — дык нікім і нічым яны не валадарылі. Шмат хто ведаў са школы, што Піліп Пястрак, які таксама згадваецца ў менскім рамане, напісаў раман «Сустрэнемся на барыкадах». Але хто той раман чытаў? Трохі чыталі хіба Шамякіна, Мележа...

— А Куляшова, Панчанку?

— Я не кажу пра паэзію. Але і Панчанка, і Куляшоў, які напісаў «Хамуціуса», не стварылі таго, што стварыў Караткевіч, — міфалагічна-гістарычную беларускую літаратуру. Па сутнасці,

ён паспрыяў узнікненню цікавасці да гісторыі і ўзнікненню беларускіх гісторыкаў, якія, адчуўшы, што выклікаюць цікавасць у чытача, сталі пісаць так, каб гэта было цікава.

З'яўленне Караткевіча ў менскім рамане адпавядае чаканням галоўнага героя, пятнаццацігадовага хлопчыка з ягонымі ўяўленнямі пра тое, якой павінна быць літаратура ў краіне, дзе ён жыве, якімі павінны быць літаратары і як яны павінны пісаць, каб гэты хлопчык зразумеў, у якой прасторы, у якім часе ён жыве, што тут ёсць каштоўнасць, а што — брыда.

— Дарэчы, вельмі добра выпісаны ў рамане эпізод у Саюзе пісьменнікаў з літкансультантамі, Кімам Сысоем і Уладзімірам Караткевічам, хоць зразумела, што эпізод — цалкам прыдуманы...

— Ты так мяркуеш?.. А паэт Анатоль Вярцінскі, які прыблізна ў той час якраз і быў літкансультантам Саюза пісьменнікаў, прачытаў гэты эпізод як спісаны з натуры. Ну амаль... Спытаў: «Мяне ж там няма, праўда?» *(Смяецца.)* Ён самы першы патэлефанаваў, прачытаўшы раман у «Дзеяслове». І як пачаў? «Ведаеш, што я табе скажу? Збылася мара Алеся Адамовіча пра звышлітаратуру!..» Падазраю, што Вярцінскі такі камплімент пракінуў, бо ўсё ж ён ёсць у рамане. Верш свой чытае, які я вельмі люблю:

«Спартак, Спартак! Героі ўсіх эпох!
Ці не такі быў лёс ваш у фінале:
Як нехта моцна спаў, вас распіналі,
Вы ціха на крыжы сваім каналі,
І білася жанчына каля ног!»

Гэта якраз у стылістыцы 1960-х гадоў. Я таму і скарыстаў верш Вярцінскага пра Спартака, што ён цалкам супадае з тым часам.

Дарэчы, у менскім рамане і Рыгор Барадулін чытае свае вершы...

— А яго не прызнаў. Гэта той студэнт-філфакавец, які ад гэбіста ў тэатр збег?

— Так, які збег у тэатр. А не прызнаў ты Барадуліна, бо ён чытае верш, якога ты не ведаеш. Я папрасіў яго напісаць што-небудзь наўмысна для рамана. Спытаў: «Ты ж не пісаў антысавецкія вершы ў 1960-я гады?» — «Не, — кажа, — не пісаў». — «Дык напішы цяпер». Не прайшло і паўдня, як Барадулін *(смяецца)* тэлефануе і чытае:

Рахманыя, няўпартыя,
Мы ўсе — адзін калгас.
Кіруе намі партыя
І думае за нас.
Дазвол ёсць жыць у лагеры
Сацыялізма ўсім.
Дарма буржуі звягаюць,
Мы не зайздросцім ім.
На волю нам не хочацца,
Мы рушым свет стары,
І вораг не праточыцца
У цвёрдыя муры.
Дакладна кожны ведае:
Быў камуніст — Ікар!
Для мар пра заўтра светлае
Хапае голых нар.

З гэтым вершам я і паставіў Рыгора Барадуліна на прыступкі Тэатра юнага гледача ў 1962 годзе. Хоць, калі быць дакладным, дык вершы звычайна чыталіся там, дзе цяпер кінатэатр «Піянер» — з боку лялечнага тэатра. Але адна рэч, калі вершы чытаюцца ў нейкім закутку, і зусім іншая — пад антычнымі калонамі. Зусім іншая прастора. І ёсць куды схаваць таго філфакаўца, які збег. Я ж не дакументальны раман пісаў.

Вось гэта хачу падкрэсліць: раман не дакументальны. І няма чаго шукаць: так — не так, было — не было. Магло зусім не быць нічога, а магло быць не толькі тое, пра што напісана.

— Я цяпер прыгадваю гэтую гісторыю з Барадуліным — Вы распавядалі пра яе ў «Знаках прыпынку». Калі папрасілі напісаць верш, які ён мог напісаць, але не напісаў, Рыгор Іванавіч чамусьці ўдакладніў: «У якім менавіта годзе?»

«Я пісаў раман так, як бы мы пісалі яго ўсе разам»

Дарэчы, яшчэ адзін герой рамана — даўні Ваш сябар Віктар Ледзенеў у пасляслове да «Аўтамата з газіроўкай...» напісаў, што гэтая пасляслова — «удзячнасць за нашае юначае, якое паклалася праз лёс, сяброўства — і ўдзячнасць не ад аднаго мяне. Ад усіх нас, бо колькі разоў не толькі я, але і Біг, і Гарык збіраліся напісаць такую кнігу! А напісаў, не дачакаўшыся, калі яе напішам мы, Някляеў. За мяне напісаў, за Біга, за Гарыка — за ўсіх».

Але як увогуле ўзнікла задума рамана, калі? Ці спрабавалі Вы раней падступіцца да гэтай тэмы?

— Я падумаў пра гэта ўпершыню яшчэ ў самым пачатку 2000-х гадоў, а канкрэтна — у 2001-м, калі прыехаў з Хельсінкі хаваць Кіма Хадзеева. Прыехаўшы, чакаў убачыць процьму народу, але там сабралася паўтара дзясятка чалавек. Тады і зразумеў — хоць разумець тут асабліва не было чаго... проста ўбачыў, як хутка змяніўся час і як тыя, хто яшчэ ўчора быў валадаром думак, сёння адыходзяць — і ніхто пра іх ужо не памятае.

«Пришли другие времена,
Взошли иные имена».

Падумаў: не, так з Кімам, з намі, з нашым часам не павінна быць. Але напісаць пра гэта ўсё рукі не даходзілі — іншае пісалася. Зноў прыехаў з Хельсінкі, ужо на пахаванне Быкава... Сустрэўся з Віктарам Ледзеневым, прапанаваў яму напісаць пра «антысавецкую групоўку Хадзеева». Ён жа таксама літаратар, дарэчы, не кепскі літаратар — і ў тую «групоўку» ўваходзіў. Віктар згадзіўся, нават пачаў нешта пісаць — не пайшло. І ні ў каго не пайшло — вось

і давялося ўрэшце ўзяцца за гэта мне. А ўсе ж «хадзееўцы» — пісучыя людзі...

Яны ўсе разам, не толькі Кім Хадзееў, моцна на мяне паўплывалі. І я пісаў раман так, як бы мы пісалі яго ўсе разам. Я вельмі ўдзячны ім, і вось цяпер, калі надпісваю ўжо выдадзеную кнігу, пішу — і табе гэтак надпісаў, — што гэта кніга ўдзячнасці Менску. Хоць, шчыра сказаць, не ведаю, ці варта за гэта ўдзячыць. Можа, каб застаўся я некалі ці ў Нарыльску, ці ў Маскве, дык выйграў бы болей на рулетцы лёсу. Зрэшты, кожны з нас думае, што пры нейкім іншым рашэнні, прынятым у той ці іншы час жыцця, далейшы наш лёс быў бы лепшым. Але гэта не абавязкова — ён мог быць *(усміхаецца)* значна горшым. Галоўны герой рамана «Лабух» пра гэта кажа: калі ты дасюль жывы, пры сваёй галаве і на сваіх нагах, значыць, усё, што ты рабіў дасюль, зроблена правільна. У той жа Маскве я мог пад трамвай трапіць...

— Ці спіцца.

— Ну, наконт спіцца — гэта нам не дадзена, але...

— Хоць, з другога боку, спіцца можна паўсюль.

— Алкагалізм — хвароба, якая найчасцей перадаецца нашчадкам ад продкаў. Не было нікога ў нашай сям'і ні з боку бацькі, ні з боку маці, хто б давёў сябе да такога стану...

— Мяркую, магчымасць змяніць гэтую статыстыку Вы ўжо шчасліва страцілі.

— Не, не ўсё згублена! Ва ўсякім разе, адзін з маіх колішніх сяброў напісаў у газеце «Советская Белоруссия», што я алкаш і кандыдатам у прэзідэнты стаў па п'янцы. Так што калі стану прэзідэнтам... *(Смяецца.)*

— У сувязі з пахаваннем Хадзеева прыгадваецца развітанне з Андрэем Вазнясенскім, якое Вы ў сваіх «Знаках прыпынку» згадвалі. Ідучы да Дома літаратара, дзе і адбывалася развітанне з Вазнясенскім, Вы чакалі ўбачыць натоўп на вуліцы, але людзей аказалася няшмат — усе, хто прыйшоў развітацца, умясціліся ў Дом літаратара...

— Калі бачыў, як на стадыёне ў захапленні слухалі вершы дзесяць тысяч чалавек, дык чакаеш, што развітацца прыйдзе хоць бы дзясятая частка тых людзей...

— Не памерлі ж яны ўсе.

— Так, не памерлі ж яны. Ва ўсякім разе, не ўсе. Але, але, але... Яўген Яўтушэнка, з якім каля труны Вазнясенскага на сцэне Дома літаратара мы стаялі побач, сказаў мне ціха: «Когда нам придет пора, Володя, зал, наверное, вообще будет пустой». А ён жа таксама чытаў вершы на стадыёнах. І хоць ягоныя вечары паэзіі ў Політэхнічным музеі дасюль збіраюць поўную залу, але аўдыторыя збіраецца паважная — моладзі амаль няма. Прыходзяць тыя, хто ў гэтым жа Політэхнічным слухаў яго і дваццаць, і трыццаць, і пяцьдзясят гадоў таму. Ну а мне сёння



нават у бібліятэцы выступіць не даюць — якія там стадыёны...

Між іншым, не далі мне выступіць з развітальным словам і на пахаванні Вазнясенскага. Сказалі: «От Белоруссии мы уже получили соболезнование президента Александра Григорьевича Лукашенко, так что вы, Владимир, нас поймите...»

— Дарэчы, немагчыма, канешне, сказаць, што думаў Іван Антонавіч Брыль, але ён, відаць, таксама разумеў, што час мяняецца, і таму ў тастаменце папрасіў, каб развітанне адбывалася дома — не ў Доме літаратара ці дзе яшчэ. Між тым вельмі слушнай падалася Ваша думка, што гэта ўжо ўлада не дапусціла народнага развітання з Янкам Брылём, бо ў памяці засталося народнае развітанне з Васілём Быкавым. Вы пісалі, што падобныя страты толькі яднаюць нацыю, а гэта — ужо небяспека для сённяшняй улады.

— Так, канешне. Пахаванне Быкава — адна з найзапамінальных для ўсіх, хто там быў, падзей. Пяцьдзясят тысяч людзей прыйшлі развітацца — як на Плошчу! Нідзе ў свеце пісьменніка так не хавалі. Гэта беларускі феномен.

Уладам такое выяўленне народнай павагі і любові да пісьменніка, вядома, не спадабалася. Яно іх нават напалохала, бо любіць і паважаць апошнім часам «паложана» ў нас толькі аднаго... Таму, калі памёр Янка Брыль, было зроблена ўсё, каб ягонае пахаванне прайшло ціха і непрыкметна. Ну так яно ўсё ж не прайшло, але і неператварылася, як у выпадку з Быкавым, у стыхійнанародную дзею.

Труну выносілі з дома, развітваліся ў двары... Пахавалі Брыля, як ты ведаеш, у Калодзішчах. Перад ім памерла ягоная жонка, для якой, а значыць, і для сябе, ён прасіў месца на Кальварыйскіх могілках — месца не далі. Гэта ж амаль цэнтр Менска, ці мала што. А ў Калодзішчах на могілках мітынгуйце сабе. Тагачасны галоўны ідэолаг спытаў, калі з Саюза пісьменнікаў перадалі просьбу Брыля пра тое, каб жонку пахаваць на Кальварыі: «А сам он разве еще живой?..»

Што ж, паўсюль у Беларусі зямля беларуская. У мяне, дзякуй Богу, ёсць Крэва — і ёсць месца, дзе пакласціся.

— Калі Вы ўжо пра гэта загаварылі, у Вас жа ў вершы «Запавет» ёсць пра гэта:

Па-над Юр’явай гарой,
Па-над Магеравым полем,
Па-над крэўнай стараной
З неба мой развейце попел.

Па-над Крэвам, дзе святыя
Для мяне пагоркі ўсе...

Ціха лягу я на тыя,
Куды вецер занясе.

— Так... Але з кім ні дамаўляюся, каб спалілі, — дамовіцца не магу. Ні з братамі, ні з жонкай... Кладзіся, кажуць, як усе ляжаць. Няма ў Крэве такой завядзёнкі: *«З неба мой развейце попел»*. Так вось нешта напішаш, а пасля мучышся... *(Усміхаецца.)* Ну ды час яшчэ нібыта ёсць, можа, удасца некага ўламаць. Трэба будзе з бацюшкам пагаварыць. *(Смяецца.)* Яму смаргонскія ідэолагі забаранялі ў царкву мяне пускаць, калі я кандыдатам у прэзідэнты быў і ў Крэва прыязджаў. Во да якога ідыятызму можна дайсці, выслужваючыся!.. А ён ім адказаў: «У царкве не я, а Бог — гаспадар, і не магу я не пускаць тых, хто да Яго прыходзіць». З такім святаром можна, бадай, дамовіцца. *(Зноў смяецца.)*

— Але наўрад ці Ваша маці была б таму рада, бо сапраўды ж не было такой традыцыі...

— Ну можна ж памарыць, карціну намаляваць?.. *(Смяецца.)* Уявіць, як мае браты — я на іх разлічваю — дамаўляюцца з нейкім верталётчыкам, ён узлятае над Крэвам...

— А раптам вецер?


— І не ў той бок? *(Смяецца.)* І, як тыя божыя кароўкі з менскага рамана, я злятаю з неба не туды? Ну можа і такое быць. Але там паўсюль пагоркі родныя, куды ні ўпадзеш — паўсюль свая зямля... Ці ты хочаш, каб я перапісаў верш? *(Смяецца.)*

— Лепш новы напішыце.

— Ну калі просіш, падумаю...

— Вяртаючыся да Вашага рамана, зазначу, што Кім Хадзееў (Вы далі яму мянушку Палкоўнік) выпісаны Вамі даволі непрывабным. Але калі ўзяць рэальнае жыццё, дык ці сапраўды ён застаўся ў Вашай памяці менавіта такім чалавекам?

— Па-першае, не я даў Хадзееву мянушку Палкоўнік — яна ў яго насамрэч была. Па-другое, не выглядае ён, па-мойму, такім ужо непрывабным... Ва ўсякім выпадку, выпісваць яго такім я не меў на мэце. Ён неахайны быў, проста неахайны. У яго жытло было, як у бадзяжніка. А я рос у сям’і хоць і беднай, але ў такой, у якой, калі ў доме на фіранку муха села, дык маці адразу фіранку мыла і прасавала; і падлога, перад тым як на працу пайсці, мылася ці падмяталася і пасля працы зноў падмяталася ці мылася; і калі анучка, дык яна не мокла і не прэла, а выкручвалася, і калі палавічок — дык выбіваўся. А тут... Ну вэрхал. Але ўсё знешняе засланялася тым, што было ўнутры ў гэтым чалавеку. Калі ён пачынаў прамаўляць, нешта даводзіць, ты слухаў, рот разявіўшы, і нічога наўкол не заўважаў... Да нейкай ягонай выхадкі: ён мог вельмі нечакана на што заўгодна зрэагаваць, прычым даволі рэзка...


К. Хадзееў

Кожны з нас успрымае аднаго і таго ж чалавека па-рознаму. І, магчыма, Хадзееў быў не зусім такі, якім мне запомніўся. Магчыма. Віктар Ледзенеў, які лепш за мяне яго ведаў, таксама, раман прачытаўшы, сказаў: «З Кімам ты перабраў». Згаджаюся: «Можа быць. Але давай успомнім, — кажу, — колькі табе было гадоў і колькі мне...» Калі аднаму 15, а другому 23 — гэта вялікая розніца. І розніца не толькі ў досведзе — у рэфлексіях, рэакцыях. Дый досвед... Дзяцінства Ледзенева ў ГУЛАГу прайшло, куды ягонага бацьку саслалі, у пасяленні, дзе ён і не такога набачыўся...

Увогуле было быццам бы два наборы слухачоў хадзееўскай школы: пасля першага і пасля другога ягонага арышту. Адны сыходзілі, іншыя прыходзілі, але асяродак людзей, якія былі з Кімам насамрэч блізкія, быў заўсёды невялічкі. Я да яго не належаў. І не толькі па прычыне ўзросту (у гады «другога набору» я ўжо быў далёка не хлапчуком). Не ўсё мне падабалася, не ўсё было маім, а нечага, асабліва тады, калі на гуру раптам набягалі, як на скалісты бераг, хвалі рэвалюцыйнага ўздыму, я проста асцерагаўся...




На экскурсіі з ансамблем народных інструментаў Смаргонскага РДК у Крэўскім замку. 1959 год

— Менавіта асцерагаліся?

— Так, хоць у гэтым можна было б цяпер і не прызнавацца. Асцерагаўся яшчэ да таго, як са мной у КДБ прафілактычную гутарку правялі. Мой бацька быў чалавек сталінскай закваскі. Які тут антысаветызм?! Ён ашалеў бы, калі б дазнаўся! Нават не ведаю, што б тады са мной сталася. У яго ж пісталет быў... *(Смяецца.)*

«Усе ў гэтай краіне некага ці нечага чакаюць»

— Адна справа — мастацкі твор, іншая — рэальнае жыццё. Раман пачынаецца з тралейбуса, які пахне свежавымытым жалезам і ранішнім халадком, з водару пралесак, што ляжалі на заднім сядзенні тралейбуса, з дзяўчынкі ў каптурыку і з кандукаркі Віялеты Казіміраўны, урэшце, з паведамлення радыё пра тое, што першы сакратар ЦК КПСС Мікіта Хрушчоў даслаў ліст вучням нью-ёркскай школы. Але з чаго канкрэтна пачаўся Ваш Менск, калі ўпершыню прыехалі сюды?



Радыёмеханік Мінскага тэлевізійнага атэлье № 2 (фота на службовае пасведчанне), 1970 год

— Менск пачаўся для мяне раней, чым я паступіў у тэхнікум сувязі. Я граў у ансамблі народных інструментаў імя Агінскага Смаргонскага раённага Дома культуры — спачатку на домбры, а пасля на кантрабасе, бо выявілася, што з усіх маіх музычных талентаў (я, дарэчы, і спяваў някепска) найбольш развітае ўва мне адчуванне рытму. Гэта вызначыў Аляксандр Анісімавіч Дзяруга — адзін з тых людзей, якія рэальна паўплывалі на мой лёс, таму што ён вылавіў мяне пасля бойкі ў смаргонскім парку і зацягнуў у Дом культуры, у той самы ансамбль імя Агінскага. Літаральна праз паўгода мы перамаглі ў Смаргоні на раённым конкурсе, пасля — у Гародні на конкурсе абласным. І з перамогай прыехалі ў Менск, каб паказацца па тэлебачанні. Ад чыгуначнага вакзала да Круглай плошчы, дзе была тэлестудыя, мы пайшлі чамусьці (можа, каб грошы з’эканоміць) пехатой, і, калі падышлі да месца, дзе Дом афіцэраў, чалавек, які намі апекаваўся (адзін з настаўнікаў нашай школы па прозвішчы Шпак), раптам — плясь! — лёг на асфальт, на ходнік — і вось так, руку прыставіўшы да лба, уніз за раку Свіслач, як Чапай за раку Урал, глядзіць... Мы разгубіліся, стаім і не ведаем, што рабіць. Ну як — ішоў-ішоў чалавек і раптам на бруха ўпаў і ў далячынь уперыўся! А ён, паляжаўшы, уздыхае і кажа: «Вы паглядзіце, якія дурні ў гэтым горадзе жывуць!.. Вось тут, дзе мы з вамі, гара (Дом афіцэраў сапраўды на самым высокім месцы ў Менску стаіць), а тэлевежу яны паставілі там, дзе рака, у нізіне. На чвэрць вышыню шпіля зрэзалі, а ён жа чым вышэй, тым лепш! Наўрад ці гэтыя людзі ў гэтым горадзе дажывуць да нечага добрага, і наўрад ці, хлопчыкі, вас убачаць у Смаргонях...»

У Смаргонях нас усё ж убачылі, а ў астатнім я не перастаю здзіўляцца празорлівасці майго школьнага настаўніка, смаргонскага чалавека па прозвішчы Шпак.

— Ваш раман шмат у чым аўтабіяграфічны — у першую чаргу некаторымі сюжэтнымі лініямі, асабліва што датычыцца «антысавецкай групоўкі» Кіма Сысоя і прэзідэнцкіх выбараў 2010 года. Аўтабіяграфічны і асобнымі эпізодамі: скажам, кароценькім аповедам пра Вашага бацьку, які ледзь што, дык адразу хапаўся за пісталет, ці гісторыяй, як Вы выбілі зуб афрыканскаму студэнту (толькі ў рэальным жыцці Вы выбілі той зуб па іншай, чым у рамане, прычыне), ці калі Вас збіраліся адлічыць з тэхнікума, і Ваша мама прыехала, каб даць хабар дырэктару. Нарэшце, амаль аўтабіяграфічная і сцэна каля Тэатра юнага гледача, на прыступках якога выступалі менскія паэты і барды. Вы ж таксама, калі яшчэ вучыліся ў тэхнікуме, чыталі на адным з такіх сходаў свой верш, тады ж і пазнаёміліся з Кімам Хадзеевым. Але ў Вашым рамане няма аднаго эпізоду, пра які распавёў у пасляслове Віктар Ледзенеў, — як Вы, вырашыўшы праз няшчаснае каханне скончыць жыццё самагубствам, хацелі скочыць з моста ў


З жонкай Вольгай

Свіслач. А тым часам Вашы сябры выплылі з-пад моста у лодцы з труной (труну ўзялі ў Рускім тэатры, а лодку — на лодачнай станцыі): «Ну давай! Кідайся!..»

— Ну тут Ледзенеў, як ён сам мяне ў стаўленні да вобраза Кіма папракаў, трохі перабраў. Хоць што праўда: калі я ўжо ўпадаў у каханне, дык, што называецца, з вушамі. Сэнсу жыць без кахання не бачыў ніякага... Я, дарэчы, забыўся спытаць Ледзенева — добра, што ты нагадаў. Няўжо я быў у такім стане, што мяне трэба было *(смяецца)* ратаваць ад самагубства?.. Помню, што было невыносна. Але ці было невыносна да такой ступені, каб кінуцца ў Свіслач, — не помню... Увогуле ж суіцыдныя настроі ў юнацтве ў мяне не раз здараліся. Я нават здзіўляюся, што ўсе іх перажыў...

— У часы Вашай вучобы і жыцця ў Менску Вы належалі да моладзевай субкультуры, якая яшчэ ў той час атрымала назву — стылягі. Канешне ж, Вы чулі пра Аляксея Сямёнавіча Казлова...

— Так, ведаю, і хто такі, і што такое Аляксей Казлоў.

— Лідар знакамітага джаз-рок-ансамбля «Арсенал», вядомы па мянушцы «Казёл» (якая, відаць, звязана з яго прозвішчам ды джазавай бародкай), ён таксама быў стылягам, але значна раней за Вас ды Вашых сяброў — яшчэ ў сярэдзіне 1950-х. Вось як ён распавядаў пра той час: «Танцы вообще были центром существования. Тогда — в начале 50-х — имелись танцы "рекомендованные" — вальс, полька, падеспань, и "нерекомендованные" — танго, фокстрот и прочие, которые мы знали только по названиям — "джиттербаг", "линда"... Было три стиля танца — "атомный", "канадский" и "тройной гамбургский"... То же и с одеждой: лишь в 1971 году я увидел живой прототип нашего стиля. Это был Дюк Эллингтон, когда его оркестр приезжал к нам на гастроли. Узкие короткие брюки, большие ботинки, длинный клетчатый пиджак, белая рубашка, галстук. Галстуки были очень яркие и длинные, ниже пояса, с узким узлом и широкие внизу. Мой любимый был с серебряной паутиной; другие носили галстуки с пальмами, обезьянами, девушками в купальниках...»

Але, зыходзячы з Вашага рамана, менскія стылягі значна адрозніваліся ад стыляг маскоўскіх, і не толькі па часе існавання...

— Вопратка стылягаў, канешне, мянялася, пра гэта ў менскім рамане даволі падрабязна напісана. Трэба яшчэ ўлічваць тое, што ад Масквы, дзе стылягі ўпершыню прайшлі па «брадвэі», вуліцы Горкага, яшчэ ў канцы 1940-х, да Менска яны крочылі даволі доўга.

— І вось што яшчэ казаў Аляксей Казлоў пра манеру трымацца маскоўскіх стыляг: «...у нас была отработана и своя походка, и манера держать голову. Голова была задрана высоко и все время болталась, будто мы что-то высматривали». Між тым у рамане Вы вельмі каларытна апісалі праход стыляг: «Як мы йшлі!.. Як стракатыя кашулі

шапталіся ды скураныя шузы парыпвалі!.. “Брадвэй” рассцілаўся, расцякаўся перад намі, а мы па ім — культурненька, акуратненька. Не каля самых сцен, але й не нахабна пасярод, каб не надта сучаснікам замінаць, суайчыннікаў не моцна раздражняць, бо яны не вінаватыя, што такія… І кожнаму, каго выпадкова зачэпім, нашае даруйце, прабачце…»

— Тут трэба разумець, што маскоўскія стылягі канца 1940-х — пачатку 1950-х — гэта дзеці членаў ЦК, міністраў, вельмі ўплывовых чыноўнікаў…

— Так званая залатая моладзь.

— Так, «залатая моладзь». І яны, вядома, пераймалі звычкі сваіх бацькоў: маглі цыкнуць на міліцыянта, калі той падыходзіў да іх: «Пшёл вон!» У Менску гэта быў трошкі іншы кантынгент: пераважна дзеці сярэдняга слоя грамадства: дзеці пісьменнікаў, артыстаў, рэжысёраў. Былі і дзеці начальнікаў, але не з найвышэйшай касты. Таму мы і хадзілі па вуліцах інакш. Але ўсё адно гэта выглядала выклікам — нават проста праз адзежу. Наўкол жа шэрая маса. Прычым да гэтай пары. Ты паглядзі: Менск пераважна шэры, каляровае, стракатае рэдка заўважыш.

— Шэрае ці цёмнае — яно ж практычнае.

— Я разумею, але тым не менш. Даўно даведзена, што зрокавыя вобразы, фарбы, як і гукі, уплываюць на нашу свядомасць, паводзіны, а праз тое — на ўзровень, якасць жыцця. Наогул, там, дзе сонца, там, дзе фарбы, — там… там і Рыадэ-Жанейра, горад, пра які марыў Астап Бэндэр, які ў пэўным сэнсе быў стыляга.

— А якія Вашы любімыя колеры?

— Белы, чырвоны, зялёны… Бачыш, я табе назваў колеры дзяржаўнага і нацыянальнага сцягоў. *(Смяецца.)*

— Але ж не наўмысна.

— Не наўмысна. Насамрэч белы, чырвоны, зялёны. Яшчэ сіні, бо гэта колер вады і неба.

— Хацелася б пагаварыць з Вамі пра асобных герояў Вашага рамана. Галоўны герой (дый не ён адзін) быў закаханы ў Асю. Але з той жа паслямовы Ледзенева ведаю, што Асі насамрэч не існавала. А вось наконт татаркі Нэлы — тут, відаць, рэальны прататып усё ж быў?

— Так, яна амаль што спісаная з дзяўчынкі, якая вучылася ў медычнай вучэльні.

— Але імя яе іншае?

— Не, тое самае. Нэла.

— І Вы сапраўды, як у рамане, зноў убачыліся з ёй праз амаль пяцьдзясят гадоў, якраз напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2010 года?

— Убачыў, але ў рэальным жыцці я да яе не падышоў, таму што гэтак здзівіўся тым зменам, якія з ёй адбыліся, што падумаў: сведка гэтых зменаў не надта ёй глянецца. Я не столькі праз сябе не падышоў, колькі праз яе.

— У рамане ёсць пра гэта: жанчыны не любяць, калі на іх глядзяць праз гады.

— А здалёк яна мяне не магла пазнаць, у яе яшчэ ў маладосці былі праблемы са зрокам, яна акуляры насіла… Гэта было каля «Цэнтральнай» кнігарні, яна ішла са сваёй сяброўкай. Тая, як мне здалося, пачала мяне пазнаваць, нешта казаць Нэле на вуха, і я падумаў: «А што я скажу? Што яна цудоўна выглядае, гэткая самая, як была, маладая?..» Ну ці падобнае, банальнае… А што яшчэ? Больш нічога. І я сышоў… Ці збег — мусібыць, гэтае слова тут болей падыходзіць — ад колішняга кахання. І яно не кінулася мяне даганяць…

Потым, у рамане, я знайшоў, што сказаць Нэле. Калі ў мінулым нешта хочаш знайсці — знойдзеш, і калі захочаш у яго вярнуцца — вернешся. Не — дык не. Жыві і не азірайся.

— А вось што тычыцца Лі Харві Освальда: Вы, наколькі ведаю, былі вельмі коратка з ім знаёмыя?

— Гэта ў рамане я коратка з ім знаёмы. У жыцці не мог ён быць маім блізкім знаёмцам — і такім не быў.

— Прозвішча сапраўднае, а ўсё астатняе…

— Усё астатняе — літаратура.

— А тое, што Кім Сысой, ён жа Палкоўнік, называе галоўнага героя не сынам палка, а сынам Палкоўніка, — нічога падобнага Кім Хадзееў Вам ніколі не гаварыў?

— Не.

— А ці ёсць рэальныя прататыпы ў гэбістаў? Ці ўсё ж гэта цалкам прыдуманыя персанажы?

— Вось каго заўсёды хапала ў маім рэальным жыцці, дык гэта рэальных гэбістаў. І гэтакіх, як у рамане, і да іх падобных.

У 60-я гады мінулага стагоддзя я не меў з імі такіх шчыльных дачыненняў, як пазней, але з імі добра знаёмыя былі мае старэйшыя сябры. А я ўжо праз іх. І як Саламон Майсеевіч — зборны вобраз габрэяў, якія жылі на Нямізе, гэтак гэбіст Гурык — зборны вобраз выпускнікоў менскай вышэйшай гэбісцкай школы.

— Без усялякага сумневу, вельмі ўдала выпісаная Вамі гратэскная сцэна ў Навінках, калі хворыя і здаровыя інсцэнуюць пасяджэнне Прэзідыума ЦК КПСС. Мяркую, што гэта пародыя не толькі на ўладу часоў Хрушчова — гэта пародыя ў тым ліку і на ўладу сённяшнюю?

— Я б не сказаў, што гэта пародыя. Калі, канешне, не пародыя — сама ўлада. Як былая, гэтак і сённяшняя. Пры ўсіх уладах мы жылі, як у вар’ятні. І калі б я перанёс дзею з вар’ятні ў залу пасяджэнняў ЦК, дык было б тое самае.

Сам я ў вар’ятні не быў, але мой сябар Ледзенеў, не вытрываўшы ціску гэбістаў (у яго дайшло да нервовых расстройстваў), сапраўды патрапіў у псіхушку. І ў рамане я скарыстаўся больш ягоным досведам, чым сваім.

— А наколькі дакументальныя сцэны Вашых допытаў тады, у 1960-я гады, і пазней — у 2010–2011 гадах?

— Тут рэальнасць і літаратура дастаткова блізкія.

— Падчас допыту ў КДБ следчы кажа галоўнаму герою (г. зн. Вам): «Вам трэба было вылазіць раней. У канцы мінулага стагоддзя. Яно было нашым. Вашым і маім. Я чакаў, дый шмат хто са мной, што вы вылезеце». Ці сапраўды следчы казаў Вам такое? І як Вы самі лічыце: можа, Вы і праўда спазніліся і Ваш час быў менавіта тады — напрыканцы мінулага стагоддзя?

— Я сам здзіўляюся: чаму я лічыў раней, скажам, у 1994 годзе, што не гатовы да тых дзеянняў, да якіх гатовы сёння? Мне тады здавалася, што людзі, якія займаюцца палітыкай, злепленыя зусім з іншага цеста. Я ж не ведаў, з чаго яны злепленыя... Трымаўся на дыстанцыі ад палітыкі, як ад таго, што зусім не маё, але дыстанцыя не ратавала ад штодзённага адчування катастрофы. Знікае нацыянальная мова, гіне літаратура, культура — усё тое, без чаго не толькі я, носьбіт гэтай мовы, літаратуры, культуры, страчваю сэнс для Беларусі, але і Беларусь страчвае для мяне сэнс.

Што ж да працытаванай табой фразы следчага, дык той следчы, які вёў маю справу, мне яе не казаў. Але казалі іншыя. Усе ў гэтай краіне некага ці нечага чакаюць, мы жывём у часе чаканняў.

— Да таго ж Вы, відаць, невыпадкова дадалі да рамана ўсе гэтыя дакументы: фрагменты з даклада М. Хрушчова на XX з'ездзе КПСС пра культ асобы І. Сталіна, стэнаграму сустрэчы Хрушчова з творчай інтэлігенцыяй, фрагменты з даклада прэзідыума ЦК КПСС (цяпер ужо пра культ асобы М. Хрушчова). Па-першае, яны ствараюць (ці дакладней, узмацняюць) эфект дакументальнасці Вашага рамана. Па-другое, мяркую, такім чынам Вы наўмысна правялі недвухсэнсоўную паралель з сённяшнім днём, бо з часоў Сталіна і Хрушчова ў гэтай краіне мала што змянілася — кажу ў дадзеным выпадку выключна пра ўладу...

— Абсалютна правільна ты ўсё зразумеў. І я хацеў бы, каб тыя, хто пытае: «А навошта ты дадаў да рамана дакументы і паслямову Віктара Ледзенева?» — зразумелі, што нічога я не «дадаваў», што і мой тэкст, і дакументы, і паслямова Ледзенева — тры часткі рамана, які менавіта такім мне бачыўся. Не зусім такой бачылася хіба паслямова. Я даў Ледзеневу прачытаць мой тэкст і прапанаваў яму, аднаму з герояў рамана, скончыць раман так, як бы ён скончыў яго, калі б быў не толькі героем, але і аўтарам. Вось такі апрабаваць прыём, якім ніхто яшчэ не карыстаўся. Віктар не адразу згадзіўся, сказаў, што задача складаная (яна і насамрэч няпростая), але ўрэшце напісаў тое, што напісаў. Раздзел з назвай «Вуліца Уладзіміра Някляева». Раздзел аказаўся не зусім такім, якім ён мне ўяўляўся. І тым не менш прыём быў скарыстаны, канцэпцыя рамана вытрыманая.

— Напрыканцы нашай размовы скажу, што вось чаго, мабыць, не хапае ў беларускай літаратуры, дык гэта нечага кшталту булгакаўскага «Майстра і Маргарыты». Матэрыял для гэтага — і яшчэ які! — ёсць, а твора дасюль няма. У Вас ніколі не было думкі напісаць нешта падобнае? Пытаюся таму, што ў Вас, Уладзімір Пракопавіч, безумоўна, ёсць вось гэты талент іранічнага апавядальніка.



— Дзякуй за пытанне, якое выглядае кампліментам, але раман «Майстар і Маргарыта» даўно напісаны. Што мне пра гэта думаць?

— Вы не адчуваеце ў сабе...

— Калі нешта я ў сабе і адчуваю, дык чаму павінен адчуваць менавіта гэта?..


— Я ж не кажу, што менавіта такі раман...

— І ўсё ж відаць, што думаеш пра такі. Што ж, калі раптам... дык я першаму табе скажу... *(Смяецца.)* Каб ты мне ў тым рамане, як Ледзенеў у гэтым, напісаў апошнюю частку.

БАЖ прэзентуе «Анатомію фрылансу» — дапаможнік для журналістаў-фрылансераў

Як размаўляць з чыноўнікамі? Як атрымаць пасведчанне? Ці падпісваць дамову з рэдакцыяй? Падаецца, у прафесійнай дзейнасці журналістаў-фрылансераў больш пытанняў, чым адказаў. Так было да выхаду кніжкі «Анатомія фрылансу».

Фрыланс-журналістыка — з’ява маладая. Слова «фрыланс» толькі пачало прыжывацца, журналісты сталі смялець ды часцей называць сябе па-заморску, а людзі — пакрысе разумець, што гэты «звер» не кусаецца.



Гэта пазітыўная тэндэнцыя зменаў, якім, на жаль, вельмі часта чыняцца перашкоды. Каб у прафесійнай дзейнасці фрыланс-журналістаў гэтых перашкодаў рабілася ўсё менш, у 2012 годзе пад эгідай БАЖ распачалася кампанія «За фрыланс!». І кніга «Анатомія фрылансу» сталася падсумаваннем нашага супольнага журналісцкага досведу ды эсенцыяй ведаў пра фрыланс, атрыманых за першы год кампаніі.

Для чытання «Анатомія фрылансу» даступная ў фармаце PDF на сайце http://baj.by/.

